Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЛІПЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №142 (28506)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Лепш праблемная мама, чым дзіцячы дом**



**Якое ВНУ яшчэ шукае абітурыентаў**

СТАР. 3



**Дзе яны? Лёс людзей з псіхічнымі захворваннямі**

СТАР. 4

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр ЦЕРАХАЎ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*«Мы бачым рэзервы для эканоміі рэсурсаў. У мінулым годзе прыняты рашэнні як на ўзроўні ўрада, так і на ўзроўні райвыканкамаў, якія дазволілі знізіць выдаткі на BYN260 млн. Яны працягваюць даваць эфект. Урадам зацверджана заданне на гэты год па зніжэнні выдаткаў дадаткова яшчэ на BYN93 млн. Неабходны індывідуальны падыход да кожнага аб'екта, які эксплуатуецца ў сферы ЖКГ, да кожнай арганізацыі, каб выключыць звышнарматыўнае расходаванне сродкаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9505 | ▲ |
| Еўра | 2,2671 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0752 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# РАЗДАЖДЖЫЛАСЯ...



Фота БЕЛТА.

Гродна, 26 ліпеня.

■ Напярэдадні стагоддзя

## Геалакацыя: праспект Газеты «Звязда»

ЗЯЛЁНАЕ «МОРА», КУРГАН І МАРШРУТЫ ДАІ

**Спартыўнае свята ў гонар векавога юбілею нашага выдання адбудзецца ўжо ў гэтую суботу ў 11.00 на базе спартыўнай пляцоўкі мінскага ліцэя №1, які размяшчаецца на праспекце Газеты «Звязда», 6А. У праграме — спаборніцтвы па гіравым спорце і варкаўце, майстар-клас ад сучаснага волата, рэкардсмена Гінеса Вячаслава Харанекі і гульня з удзелам найлепшага міні-футбольнага клуба краіны «Сталіца». Пакуль рыхтуюцца прызы і ўносяцца апошнія праўкі ў сцэнарый, мы адправіліся на сам праспект, каб расклеіць афішы. Склаў нам кампанію і расказаў пра гісторыю і цяперашні стан праспекта і раёна ў цэлым начальнік упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Маскоўскага раёна Андрэй КАЗАКЕВІЧ.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

СТАР. 3

■ Сябе паказаць

## ЗАВАБІМ ТУРЫСТА... АРНАМЕНТАМ?

**На ролю агульнага брэнда ён падыходзіць найлепш**

**Менавіта нацыянальныя ўзоры павінны стаць асновай для брэнда Беларусі, упэўнены старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі Філіп ГУЛЫ. Эксперт таксама падзяліўся інфармацыяй пра турыстычныя аб'екты і маршруты, што з'явіліся ў краіне за апошні час, растлумачыў, калі Беларусь атрымае дывідэнды ад увядзення пяцідзённага бязвізавага рэжыму і спрагназаваў, як адаб'ецца на турыстычнай сферы магчымае ўзаемнае прызнанне віз паміж нашай дзяржавай і Расіяй.**



Фота БЕЛТА.

СТАР. 2

Да 100-годдзя «Звязды» засталося 13 дзён

**На ўсе 100!!!**

**«Звязда» запрашае вас, шаноўныя чытачы, вашых блізкіх і сяброў на спартыўнае свята, якое адбудзецца ў суботу, 29 ліпеня, на спартыўнай пляцоўцы сталічнага ліцэя №1 (праспект Газеты «Звязда», 6А).**
**Пачатак у 11.00. УВАХОД ВОЛЬНЫ.**
**Падрабязнасці на нашым сайце www.zviazda.by**

■ Жніво-2017

# ЁСЦЬ ТЫСЯЧА!

**Рэчычане Іван Вырвіч і Алег Хвост з Агракамбіната «Холмеч» Рэчыцкага раёна зноў — першыя «тысячнікі» ў краіне**


Фота БЕЛТА.

Летась менавіта яны таксама намалацілі самую першую тысячу тон збожжа. Старшы камбайнер Іван Вырвіч кіруе камбайнам з 1995 года, а яго напарнік — толькі другое жніво. У Гомельскім абкаме прафсаюза паведамілі, што павіншаваць камбайнераў на поле прыехалі адказныя асобы Гомельскага аблвыканкама, Рэчыцкага райвыканкама і прафсаюзаў работнікаў АПК.

Дарэчы, у КСУП «Агракамбінат «Холмеч» ёсць яшчэ «тысячнікі». Вынік у тысячу тон па адвозе збожжа і рапсу сярод кіроўцаў старэйшых за 31 год ва Уладзіміра Трубілы і Віктара Кардаша. Тысячу тон намалоту збожжа і рапсу мае экіпаж Васіля Коваля і Мікалая Велікаборца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# ЗАВАБІМ ТУРЫСТА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Калі гаварыць пра брэнд Беларусі, то, на маю думку, мноства рэгіянальных, лакальных брэндаў павінны мець які-небудзь агульны, скразны элемент, які паўтараўся б усюды: ад рэспублікі, вобласці, горада да невялікага рэгіёна ці турыстычнага кластара, — лічыць Філіп Гулы. — Гэта надае індывідуальнасці і ў той жа час дэманструе нашу еднасць. Маё асабістае перакананне (і многія калегі па індустрыі з гэтым згаджаюцца), што на гэту ролю найлепш падыходзіць беларускі арнамент. Ён ёсць на нацыянальных строях, дзяржаўным сцягу краіны, самалётах «Белавія»... Гэтыя сімвалы для нас вядомыя і зразумелыя. Яны глыбока архаічныя, адлюстроўваюць нашу гісторыю і культуру, асаблівасць і непаўторнасць усяго беларускага. Думаю, што ўсе жыхары краіны павінны ведаць хоць бы некалькі такіх сімвалаў, іх значэнне. Узоры могуць быць рознага колеру і памеру, але павінны прысутнічаць у любым лакальным брэндзе.

На думку эксперта, Беларусі варта працаваць над рознымі відамі турыстычнага прадукту, іх можа быць ад шасці да дзесяці. Гэта абумоўлена інтарэсамі прыезджых. Калі, напрыклад, гаварыць пра вандроўнікаў з Еўропы і Паўночнай Амерыкі, то іх захапляе ў першую чаргу культурна-пазнавальны прадукт: гісторыя XIX—XX стагоддзяў, настальгічны турызм, гісторыя старажытнасці і Сярэднявечча, савецкая і постсавецкая спадчына. Што датычыцца гасцей з краін Азіі, то тут у першую чаргу варта рабіць упор на прыродны комплекс, сапраўдны еўрапейскі ландшафт.

Сярод значных турыстычных аб'ектаў, што з'явіліся ў краіне за апошні час, асабліва важнай Філіпу Гуламу падаецца рэалізацыя праектаў спа-комплексаў і невялікіх гасцініц высокага класа, куды чалавек мог бы прыехаць, каб адпачываць на прыродзе, рэлаксаваць, гуляць з дзецьмі. Гэта дазволіць стварыць канкурэнцыю з аналагічнымі пляцоўкамі ў Польшчы і Літве, магчыма, затрымаць саміх беларусаў і іх грошы на радзіме. У ліку такіх аб'ектаў называюцца, напрыклад, санаторыі «Радон» і «Пліса».

— За апошнія два гады аддаленыя аб'екты (храмы, манастыры, замкі) сталі яшчэ больш прыцягальнымі для замежных турыстаў, прычым не толькі расійскіх, — сцвярджае старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі. — Часткова на гэта паўплываў бязвізавы рэжым, часткова прыйшоў патрэбны час. Выдатна, што да нас паехалі суседзі: літоўцы, палякі, латвійцы, эстонцы. Іх, безумоўна, больш цікавіць глыбінка, усё, што звязана з гісторыяй. Мясцовае насельніцтва адгукаецца — гэта відаць і па рабоце гідаў, краязнаўцаў, стваральнікаў сувенірнай прадукцыі. Пакуль што сфера знаходзіцца ў зародкавым стане, да сапраўднай якасці яшчэ далёка, але раней не было і гэтага.

Разважаючы пра ўвядзенне пяцідзённага бязвізавага рэжыму, Філіп Гулы адзначыў, што сапраўдныя вынікі гэтага рашэння стануць прыкметнымі значна пазней. Так, у Беларусь ужо накіраваліся актыўныя індывідуальныя турысты. Шмат бізнесменаў, гасцей, якія прыязджаюць з рознымі мэтамі. А вось арганізаваныя групы трапяць да нас троxі пазней, бо глыбіня планавання адпачынку і, адпаведна, продажу тураў аператарамі звычайна складае прыкладна год. Па гэтай прычыне судзіць аб уплыве на колькасць прыезджых можна будзе толькі ў 2018-м. Тым не менш «бязвіз» ужо моцна палепшыў нашу інтэграцыю з Літвой і Латвіяй. Сёлета павялічылася колькасць аўстралійскіх турыстаў і экскурсійных груп з Ізраіля. Прычым гэта класічны турызм, а не настальгічны, этнаграфічны ці рэлігійны.

Філіп Гулы ўпэўнены, што ўвядзенне курортнага збору (тая мера цяпер абмяркоўваецца ў Расіі) для Беларусі — мера непатрэбная. На яго думку, пакуль аб'екты размяшчэння не загружаны больш чым на 80 працэнтаў, бессэнсоўна ўводзіць такі падатак — лепш мець больша аб'ём па меншым коште. Трэба ўлічваць, што турыст і так дае краіне вялікую колькасць даходаў, якія нідзе не відаць: сілкуецца, траціць грошы на паездкі, сувеніры. Галоўнае — стварыць дадатковую інфраструктуру, каб у яго быў выбар, дзе пакінуць свой «рубель». Так, напрыклад, у краіне ёсць цэлы шэраг замкаў, якія знаходзяцца ў катастрафічным стане і патрабуюць як мінімум кансервацыі, але да іх па-ранейшаму едуць турысты. Праблема ў тым, што на месцы ім няма дзе траціць грошы.

— Што датычыцца ўзаемнага прызнання віз Беларуссю і Расіяй, то станоўчае рашэнне гэтага пытання па-рознаму адаб'ецца на беларускіх кампаніях, якія займаюцца ўязным турызмам — адзначыў эксперт. — Магчыма, пацерпяць беларускія тураператары, якія не ствараюць уласнага прадукту, а займаюцца выключна продажам, у тым ліку ў анлайн-сістэмах. Расійскія ж кампаніі, наадварот, выйграюць, бо іх краіна ў турыстычным плане з'яўляецца больш прыцягальнай, брэндаванай, «раскручанай» — яны змогуць прадаваць беларускі кірунак «у давесак». Асноўная маржынальнасць у такім выпадку будзе сканцэнтравана ў руках аператараў з Расіі. У сваю чаргу, расіяне не працуюць у Беларусі самі, ім спатрэбяцца партнёры, якія зоймуцца стыкоўкай — будуць завозіць і вывозіць турыстаў, аказваць увесь набор паслуг (апроч стандартнага пражывання і экскурсій). Таму нашы кампаніі, якія ствараюць прадукт, акажуцца ў выйгрышы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Пентагон назваў дату з'яўлення ў Паўночнай Карэі ракеты з ядзерным зарадам



Паўночная Карэя зможа пастаўць на ўзбраенне надзейную міжкантынентальную балістычную ракету, здольную несці ядзерную боегалоўку, ужо налета. Аб гэтым паведамляецца ў канфідэнцыйным дакладзе Агенцтва ваеннай разведкі Пентагона, піша The Washington Post. Ацэнка ваеннага ведамства заснавана на нядаўніх ракетных выпрабаваннях КНДР і ўяўляе сабой прагноз па развіцці адпаведнай праграмы ў Паўночнай Карэі. Як адзначае WP, прагноз ЗША адлюстроўвае перагледжаныя папярэджанні ад прадстаўнікоў разведкі Паўднёвай Карэі.

### Арабскія СМІ даведаліся, дзе можа хавацца кіраўнік ІД аль-Багдадзі

Абу Бакр аль-Багдадзі жывы і хаваецца ў сірыйскай правінцыі Дэйр-эз-Зор на ўсходзе краіны, паведамляе арабская газета Al-Quds Al-Arabi. Па даных крыніц выдання, аль-Багдадзі можа знаходзіцца ў раёне паміж населенымі пунктамі Альбу-Камаль і Эль-Маядзін на мяжы з Іракам, куды перабраліся большасць кіраўнікоў і палявых камандзіраў ІД, калі баевікі страцілі кантроль над гарадамі ў Сірыі і Іраку. Як адзначае газета, тэрарыст нумар адзін «працягвае адыгрываць ключавую ролю» ў камандаванні групоўкай, нягледзячы на тое, што «падтрымліваць сувязь і праводзіць сустрэчы з іншымі членамі арганізацыі стала больш складана».

### ЕАЭС прапанавалі абмеркаваць праект адзінай разліковай адзінкі

У Еўразійскай эканамічнай камісіі лічаць, што такая мера садзейнічала б зніжэнню транзакцыйных выдаткаў пры ўзаемных разліках. Еўразійскі банк развіцця (ЕАБР) прапанаваў Цэнтрабанку краін ЕАЭС стварыць рэгіянальную разліковую грашовую адзінку. Пра гэта піша газета «Известия» са спасылкай на дырэктара Цэнтра інтэграцыйных даследаванняў ЕАБР Яўгена Вінакурава. «Ёсць шэраг інструментаў, якія мы прапануем для абмеркавання манетарным рэгулятарам, у асноўным на доўгатэрміновую перспектыву. Напрыклад, разліковую рэгіянальную грашовую адзінку — гаворка ідзе не пра адзіную валюту, а пра інструмент, які палягчае ўзаемаразлікі», — растлумачыў ён выданню.

### Рэканструявана будова самай загадкавай істоты на Зямлі



Аўстралійскія біёлагі рэканструявалі будову самай загадкавай шматклетачнай істоты, якая адносіцца да вымерлага роду рангея (Rangea). Адпаведнае даследаванне апублікавана ў часопісе Precambrian Research. Рангеі з'яўляюцца двухбакова-сіметрычнымі істотамі. Гэты род — тыповы прадстаўнік вымерлай эдзіакарскай біёты — мяккацелых істот з трубчастай структурай. Да гэтага часу спецыялісты не ведаюць, ці адносіцца дадзеныя істоты да раслін або жывёл. Камп'ютарная тамаграфія скамянеласцяў, знойдзеных у Намібіі, паказала, што адно з трох лістападобных утварэнняў рангеі мела не плоскую, а шарападобную форму.

■ Не прапусці!

## «КНІГА.BY» АРГАНІЗУЕ ФЛЭШМОБ

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі» абвяшчаюць старт 28 ліпеня новага этапу сумеснага Рэспубліканскага маладзёжнага праекта «Кніга.BY». Яго мэта — далучэнне моладзі да чытання сусветнай літаратуры розных жанраў, а таксама чытання беларускіх аўтараў на мове арыгінала. Тэматыка праекта «Кніга.BY» у 2017 годзе звязана найперш з Годам навукі і святкаваннем 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. У рамках мерапрыемства адбудзецца правядзенне дабрачынных акцый па зборы кніг для сацыяльных устаноў, арганізацыя сустрэч моладзі з пісьменнікамі і журналістамі, што пішуць пра навуку. Яго неад'емнай часткай стане акцыя «Буккросінг», якая праводзіцца па аналогіі з аднайменным сусветным рухам. Падчас буккросінгу ўсе ахвотныя змогуць абменьвацца кнігамі (пакідаць свае ці, наадварот, браць цікавыя ім выданні) на спецыяльна размешчаных у розных установах паліцах. Акрамя таго, арганізатары «Кніга.BY» плануюць правесці сярод карыстальнікаў сацыяльнай сеткі Instagram флэшмоб «З кнігай па жыцці» і заклікаюць усіх далучыцца да праекта, апублікаваўшы фота ў асабістым профілі разам з любімай цытатай з кнігі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Меркаванне



# ВІРТУАЛЬНАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ

## Інтэрнэт у сусветнай палітыцы: пагрозы нацыянальнай бяспецы

З'яўленне інтэрнэту радыкальна змяніла як нацыянальную, так і глабальную палітыку. Калі ўзяць мясцовы ўзровень, то цяпер вельмі цяжка выйграць выбары, не выкарыстоўваючы актыўна электронныя рэсурсы. Што датычыцца глабальнага ўзроўню, то тут усё не так проста. Акрамя мноства магчымасцяў, інтэрнэт дэманструе і выразныя рызыкі для нацыянальнай бяспекі. Гэтыя рызыкі можна падзяліць на дзве катэгорыі — тыя, што ўласцівыя звычайным сродкам масавай інфармацыі, і тыя, што ўласцівыя толькі самому інтэрнэту. Разгледзім спачатку традыцыйныя рызыкі.

Як і любы іншы сродак масавай інфармацыі, інтэрнэт можна выкарыстоўваць для скажэння рэальнай карціны свету ў нечых асабістых мэтах. Модная апошнім часам дыскусія ў ЗША аб «фальшывых навінах» як мэйнстрыме некаторых вельмі буйных СМІ ў поўнай меры дэманструе гэту сітуацыю. Але яна цалкам характэрная не толькі для інтэрнэту, але і для тэлебачання, газет і радыё. Калі пагледзець, напрыклад, савецкія і амерыканскія газеты часоў халоднай вайны, па рэдкай міжнароднай падзеі можна знайсці аднолькавы пункт гледжання, паколькі ўсё разглядалася і праламлялася ў духу нацыянальных інтарэсаў дзвюх краін. А яны радыкальна адрозніваліся — СССР было выгадна тое, што схіляла краіны свету да супрацоўніцтва з Масквой супраць ЗША, а Вашынгтону — з ЗША супраць СССР.

У той жа час інтэрнэт дае і новую станоўчую магчымасць — любы можа сам стаць СМІ і размяшчаць тую інфармацыю, якую ён лічыць праўдзівай.

Новай пагрозай для сусветнай палітыкі менавіта з боку інтэрнэту стала выкарыстоўванне велізарных рэсурсаў сеткі інтэрнэт для ваяўнічых мэт. Найбольшыя рызыкі нясуць кібершпіянаж, тэрарызм і кібердыверсіі.

Кібершпіянаж дазваляе з дапамогай інтэрнэту знайсці вельмі далікатную інфармацыю, якую не атрымаць звычайным шляхам. Напрыклад, вялікая рызыка таго, што тэрарыстычныя групоўкі, узламаўшы інтэрнэт-рэсурсы сістэмы нацыянальнай бяспекі буйной краіны, даведаюцца рэцэпты вырабу ядзернай, хімічнай або бактэрыялагічнай зброі і пусцяць іх у дзеянне. А выпадкі ўзлому сайтаў міністэрстваў абароны або ваенных інстытутаў той ці іншай краіны даўно ўжо перасталі быць сенсацыяй.

Тэрарызм таксама можа выкарыстоўваць інтэрнэт-рэсурсы для свайго развіцця. Калі ўзяць у якасці прыкладу тэрарыстычную групоўку «Ісламская дзяржава», то яе адносны поспех быў бы немагчымы без інтэрнэту. Менавіта там яны выказалі свае погляды і пачалі фарміраваць сеткі з дзясяткаў тысяч прыхільнікаў па ўсім свеце. І гадамі сітуацыя ў інтэрнэце тэрарыстам спрыяла. Так, глабальны рэсурс YouTube толькі нядаўна прыняў рашэнне зрабіць больш жорсткай палітыку, звязаную з забаронай трансляцый любых ролікаў, звязаных з «Ісламскай дзяржавай» і іншымі тэрарыстычнымі групоўкамі.

Кібердыверсіі таксама не падарунак. Інтэрнэт пранік настолькі глыбока ў наша жыццё, што ўжо немагчыма без яго ўявіць дастаўку прадуктаў у буйным сучасным горадзе, работу паштовай сістэмы або электрасетак. Гэтыя і іншыя рэсурсы, размешчаныя ў інтэрнэце, могуць стаць цэллю для атакі, у выніку якой жыццё мноства людзей будзе парушана. Спецыфічнай мішэнню з'яўляюцца таксама электронныя сістэмы галасавання на выбарах, якія ў некаторых краінах ужо адыгрываюць вялікую ролю. Умелыя хакеры цалкам могуць у іх умяшацца. Апошні год стаў якраз годам абмеркавання на мяжы істэрыкі ў заходніх СМІ фактаў аб быццам бы адбытым мэтанакіраваным умяшанні расійскіх хакераў у выбары ў заходніх краінах, каб прывесці да ўлады прарасійскіх палітыкаў.

Роля інтэрнэту як пагрозы часта раздзімаецца зыходзячы з уласнай ангажаванасці ў вырашэнні таго ці іншага пытання. Напрыклад, падчас чэрвеньскага візіту 2017 года Прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайтэ ў Талін спроба вучыць эстонцаў таму, што іх электронная сістэма галасавання небяспечная, сустрэла прамы адпор з боку Прэзідэнта Эстоніі, якая заявіла аб яе поўнай бяспецы. Уся справа ў тым, што Літва добраахвотна іграе адну з галоўных роляў у распальванні істэрыкі ў заходнім свеце аб «рускай пагрозе», у тым ліку і ў кіберпрасторы. Эстонія ж такой актыўнасці ў гэтай папулярнай для літоўскіх палітыкаў дзейнасці не дэманструе.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук** ■

# Геалакацыя: праспект Газеты «Звязда»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Андрэй Мікалаевіч, у гэтым годзе Маскоўскі раён таксама адзначыў круглую дату — 40 гадоў з моманту заснавання. З якімі вынікамі вы прыйшлі да юбілею?***

— Мы паднімалі архіўныя дакументы, і калі ў першыя гады пасля з'яўлення раёна тут пражывала каля 90 тысяч чалавек, то цяпер ужо больш за 290 тысяч. І раён працягвае расці, паступова сыходзяць прыватны сектар, найбольш актыўна цяпер забудоўваецца праспект Дзяржынскага. На найбліжэйшы час запланавана адкрыццё доўгачаканага басейна ў мікрараёне Брылевічы.

Неўзабаве пасля з'яўлення раён атрымаў народную мянушку «Медыцынскі». І нездарма: тут знаходзіцца Медыцынскі ўніверсітэт, 4-я і 9-я гарадскія бальніцы, РНПЦ кардыялогіі і оталарынгалогіі, Цэнтр трансплантацыі органаў і тканак, дзе праводзяць унікальныя аперацыі. Дарэчы, тут жа змяшчаецца інавацыйнае прадпрыемства «Белмедпрэпараты». Хоць прадпрыемстваў-гігантаў у раёне няма, але прамысловасць знаходзіцца на досыць высокім узроўні.

Мы можам пахваліцца таксама і сацыяльнымі аб'ектамі, напрыклад, студэнцкай вёскай. Яе ўнікальнасць у тым, што разам тут жывуць навучэнцы розных ВНУ, якія актыўна адзін з адным узаемадзейнічаюць. Напрыклад, арганізавалі фестываль нацыянальных культур «У коле сяброў». Узровень сярэдняй адукацыі ў раёне адзін з найлепшых у краіне.

***— Раскажыце, якую ролю ў жыцці раёна адыгрывае праспект Газеты «Звязда»?***

— Будаваць праспект пачалі ў 1977 годзе, якраз тады, калі з'явіўся новы раён. Так што што можна назваць нашым «першапраходцам». Праспект стаў адной з цэнтральных ліній новай забудовы. Паколькі паралельна яму ішоў праспект Газеты «Праўда», ён першапачаткова атрымаў назву — праспект Газеты «Известия».

Дакладная працягласць праспекта 2 км 49 м, на ім размешчаны 10 прыпынкачных пунктаў. Пакуль ішла рэканструкцыя праспекта Дзяржынскага, менавіта сюды была перанесена вялікая колькасць маршрутаў. Цяпер іх стала менш, але дзякуючы з'яўленню метро транспартныя зносіны можна назваць вельмі добрымі. Тут жа праходзяць і экзаменацыйныя маршруты ДАІ, праўда, нараканняў ад мясцовых жыхароў наконт гэтага я не чуў ні разу, усе ставяцца з разуменнем да будучых аўтамабілістаў.



Жыхары раёна разглядаюць афішу спартыўнага свята «Звязды», якое адбудзецца ў гэту суботу.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У цэлым праспект адносіцца да спальных раёнаў, яго аснову складаюць шматкватэрныя дамы. Але знакавы аб'ект усё ж не абышоў гэтую тэрыторыю. На скрыжаванні праспекта Газеты «Звязда» і праспекта Любімава знаходзіцца помнік археалогіі VIII—XII стагоддзяў — курган. Яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя іх тут было больш за 200, так што гісторыя гэтага месца вымяраецца тысячагоддзямі.

***— Якія пытанні зараз актуальныя для жыхароў праспекта?***

— Ніякіх вострых праблем у гэтай частцы раёна няма. У асноўным гэта пытанні бягучага характару: добраўпарадкаванне, утрыманне дваровых тэрыторый, стан дарог. Дарэчы, амаль па ўсёй працягласці асфальтавае пакрыццё было абноўлена два гады таму.

Праспект можна назваць ужо цалкам сфарміраваным, свабодных тэрыторый пад забудову няма. Гэта можна аднесці, хутчэй, да плюсаў: тут ёсць выразна наладжаная інфраструктура, няма праблемы з месцамі ў дзіцячых садках і школах. Яшчэ адна перавага праспекта — вялікая колькасць раслін і вельмі шырокія, прыгожыя зялёныя палосы.

Адным з самых важных змяненняў для жыхароў праспекта стала яго перайменаванне ў 2005 годзе, калі ён пачаў называцца ў гонар газеты «Звязда». Наогул, перайменаванне вуліц адбываецца не так часта, гэта дастаткова працаёмкі і затратны працэс. Але гэты выпадак, на мой погляд, стаў знакавай падзеяй і для раёна, і для ўсяго горада. Рашэнне аб перайменаванні прымаецца на сесіі гарсавета. А вось з ідэяй усталяваць памятную шыльду з тлумачэннем, у чый гонар названы праспект, неабходна звяртацца ў Мінгарвыканкам. Там пры наяўнасці неабходных умоў арганізацыя або фізічная асоба, якія звярнуліся з такой прапановай, могуць атрымаць адпаведны дазвол. Таксама будуць вызначаны і ўмовы вырабу, размяшчэння дошкі і наступнага падтрымання яе ў належным стане. Мне здаецца, ідэя мае вялікае гістарычнае і адукацыйнае значэнне.

***— Што трэба для таго, каб арганізаваць масавае мерапрыемства сваімі сіламі?***

— Любую ініцыятыву згодна з заканадаўствам неабходна ўзгадняць у Мінгарвыканкаме. Ва ўстаноўленым парадку падаецца заява з пазначэннем даты, фармату і прыблізнай колькасці ўдзельнікаў ад установы або групы арганізатараў, якія бяруць на сябе поўныя абавязацельствы па падтрыманні правапарадку, добраўпарадкаванні тэрыторыі пасля свята, у выпадку неабходнасці па медыцынскім суправаджэнні. Калі няма ніякіх накладак, на тэрыторыі не запланавана іншыя мерапрыемствы ці не праходзяць работы камунальных службаў, даецца адпаведны дазвол.

Быў выпадак, калі прапанавалі правесці свята ў скверы, побач з якім ішла будоўля. Дзвесце чалавек разам, а за сотню метраў вежавыя краны і рух тэхнікі. З меркаванняў бяспекі дапусціць такое мы не маглі, але прапанавалі перанесці збор у іншае месца. А нядаўна да нас звярнулася жыхарка Брылевічаў з ідэяй правесці свята мікраёна. Да гэтага яна заручылася адабрэннем Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання. Ведама, мы з энтузіязмам паставіліся да гэтага і цяпер чакаем больш дакладных прапаноў, каб прыняць рашэнне. Таксама мы падтрымліваем і вашу ініцыятыву. Спартыўнае мерапрыемства, на якім змогуць сабрацца жыхары раёна цэлымі сем'ямі, каб з цікавасцю і карысцю правесці час, — гэта не можа не радаваць. Думаю, мясцовыя жыхары з энтузіязмам адгукнуцца на вашу прапанову. А ад сябе асабіста і ад усяго раёна хачу павіншаваць любімую газету са святам: поспехаў і натхнення!

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Прыёмная кампанія — 2017

## Патрабуюцца настаўнікі фізікі і трэнеры

### У вышэйшых навучальных установах краіны абвешчаны дадатковы набор на вакантныя бюджэтныя месцы

**Як паведамілі ў Міністэрстве адукацыі, незапоўненымі па ўсіх ВНУ засталіся ўсяго 7 бюджэтных месцаў на дзённай форме навучання і 16 месцаў — на завочнай. У параўнанні з папярэднім годам колькасць вакантных бюджэтных месцаў скарацілася ў шэсць разоў: летась вакантнымі заставаліся пасля асноўнай хвалі залічэння 109 бюджэтных месцаў на дзённай форме навучання і 32 — на завочнай.**

**У Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. Куляшова абвешчаны дадатковы набор на шэсць бюджэтных месцаў па спецыяльнасці «фізіка і інфарматыка» (дзённае навучанне) і на адно месца — па спецыяльнасці «гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны» (завочнае навучанне).**

У Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры засталося адно вакантнае месца з дзённай формай навучання па спецыяльнасці «спартыўна-педагагічная дзейнасць» (кірунак — трэнерская работа па парусным спорце) і сем па гэтай жа спецыяльнасці з завочнай формай навучання па наступных кірунках: трэнерская работа па вяслярным спорце (1), па плаванні (1), па лыжных гонках (1), па боксе (1), па хакеі на траве (2), па рукапашным баі (1).

Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт абвясціў дадатковы набор на тры месцы на завочнай форме навучання па спецыяльнасцях «аўтасэрвіс», «эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве» і «сацыяльныя камунікацыі». Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту запрашае абітурыентаў на тры бюджэтныя месцы на завочным аддзяленні па спецыяльнасці «арганізацыя перавозак і кіраванне на чыгуначным транспарце». Яшчэ два незапоўненыя месцы засталіся тут па спецыяльнасці «прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва» (завочная форма).

Прыём дакументаў у рамках дадатковага набору для ўдзелу ў конкурсе на бюджэтныя месцы будзе ажыццяўляцца з 30 ліпеня па 1 жніўня.

Нагадаем, што мінімальныя балы па прадметах ЦТ, з якімі можна пастұпаць у рамках дадатковага набору, не зніжаюцца! Яны такія ж, як і мінімальныя балы, устаноўленыя для асноўнага набору. На вакантныя бюджэтныя месцы змогуць прэтэндаваць абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе пры паступленні ў іншыя ВНУ, але маюць на руках патрэбныя сертыфікаты або паступалі на іншыя спецыяльнасці ў гэту ж ВНУ. Акрамя таго, удзельнічаць у конкурсе могуць грамадзяне Украіны, што пражывалі і навучаліся на тэрыторыі Данецкай або Луганскай абласцей, якія прыбылі ў нашу краіну для атрымання дазволу на часовае або пастаяннае пражыванне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Разгул стыхіі

**У Мінску прайшоў самы моцны дождж за ўсю гісторыюназіранняў**

## ЗАЛЕВАЙ ЗМЫВАЛА НУМАРЫ МАШЫН

**У ліпені на Беларусь, як і летась, прыйшла стыхія. Моцныя дажджы і навальніцы адбыліся ў аўторак практычна па ўсёй тэрыторыі краіны. Асабліва адчувальным уздзеянне непагадзі было ў сталіцы. Паводле звестак Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, дождж, што прайшоў у Мінску ноччу з 25 на 26 ліпеня, увогуле стаў самым моцным за ўсю гісторыю назіранняў. За суткі выпала 77 міліметраў ападкаў, што складае 87 працэнтаў месячнай нормы. Раней рэкордным быў дождж, які прайшоў у 1973 годзе, тады выпала 73 міліметры ападкаў (83% месячнай нормы).**

Жыхары і госці сталіцы, што знаходзіліся вечарам у цэнтры горада, сутыкнуліся са шматлікімі праблемамі. Моцная залева падтапіла 14 участкаў дарог, з-за гэтага спынілі або абмяжоўвалі рух 37 тралейбусных і 22 аўтобусныя маршруты. Няпросты вечар выдаўся і для ратавальнікаў — яны эвакуіравалі з падтопленых зон прыпаркаваныя аўтамабілі (сумарна 8 машын). Праводзіліся работы па распілаванні паваленых дрэў і адпампоўванні вады. На шчасце, ад стыхіі ў сталіцы ніхто не пацярпеў, цяпер у горадзе вядуцца аднаўленчыя работы. У твітэр-акаўнце ГУУС Мінгарвыканкама паведамляецца пра шматлікія выпадкі змывання залевай аўтамабільных нумароў. Калі вы раптам знайшлі нумарны знак, трэба звярнуцца ў ДАІ па адрасе: праспект Дзяржынскага, 3 у кабінеты 110 і 113.

Пад ударам стыхіі аказаліся і рэгіёны, асабліва заходнія. Так, напрыклад, у Брэсце выпала 29 працэнтаў месячнай нормы, у Баранавічах — 51 працэнт, у Ганцавічах — 58 працэнтаў. А ў Самахвалавічах, што пад Мінскам, — 104 міліметры, гэта 116 працэнтаў месячнай нормы! У Гродзенскай вобласці з-за ўдараў маланкі адбылося тры пажары. Гарэлі гаспадарчыя пабудовы ў Зэльвенскім і Астравецкім раёнах, а таксама нежылы дом на Ашмяншчыне. Ужо 26 ліпеня новую хвалю стыхіі сустрэў Гродна. На некаторых вуліцах узровень вады быў вышэйшы за бардзюр. У Берастявіцкім і Слонімскім раёнах моцныя дажджы падтапілі падворкі: у першым выпадку ратавальнікі адпампоўвалі ваду з двароў трох прыватных дамоў, у другім — з некалькіх падворкаў і гаража.

Паводле звестак ДВА «Белэнерга», за суткі ў выніку непагадзі перыядычна парушалася энергазабеспячэнне ў прыблізна 200 населеных пунктах па ўсёй краіне. У сярэднім на аднаўленчыя работы ішло каля гадзіны. Аднак у той жа час адзначаецца, што масавых і надзвычайных пашкоджанняў энергасеткі не фіксавалася. Раніцай 26 ліпеня ў большасці населеных пунктаў энергазабеспячэнне было адноўлена. Паводле прагнозаў сінаптыкаў, кароткачасовыя дажджы і навальніцы чакаюцца і сёння. Падчас навальніц парывы ветру будуць дасягаць 14 метраў за секунду. Уначы чакаецца 13—19 цяпла, удзень — 23—29.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■

## ЧАКАЕ КНІЖНЫ ЛЬВОЎ!..

**XXIV Кніжны кірмаш пройдзе з 13 па 17 верасня ў Львове.**

Па традыцыі ў ім абавязкова прымуць удзел і беларускія кнігавыдаўцы. Кніжны кірмаш у Львове — адна з аўтарытэтных пляцовак на Украіне. Ды і не толькі ва Украіне. Сотні выдаўцоў, пісьменнікаў сустракаюцца штогод у старажытным горадзе, каб паказаць свае новыя праекты, абмяняцца вопытам, знайсці тыя тэхналагічныя і творчыя рашэнні, што дапамогуць па-ранейшаму прыцягваць увагу чытачоў папяровай кнігі.

— Для нашага выдавецтва Львоў кніжны — гэта асаблівы адрас, — расказвае дырэктар кіеўскага выдавецтва «Яраславаў вал» вядомы ўкраінскі празаік, публіцыст Міхайла Слабашпіцкі. — І сёлета ў нас ёсць што паказаць сябрам, калегам. Дарэчы, мы выдаём і беларускую літаратуру ў перакладзе на ўкраінскую мову.

Варта заўважыць, што і беларусам ёсць што паказаць з кніг украінскіх пісьменнікаў на беларускай мове. У прыватнасці, Выдавецкі дом «Звязда» ў апошні час падараваў юнаму чытачу дзве дзіцячыя кнігі Міхайлы Слабашпіцкага. У літаратурна-мастацкіх часопісах «Полымя», «Маладосць», газеце «Літаратура і мастацтва» апошнім часам неаднойчы друкаваліся ўкраінскія паэты, празаікі: Аляксей Кананенка, Галіна Тарасюк, Уладзімір Даніленка... Гаворка пра беларуска-ўкраінскія літаратурныя стасункі пойдзе і ў час работы Міжнароднага літаратурнага фестывалю, якія пазначаны ў праграме Львоўскага кніжнага кірмашу.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ «Звязда» даследуе праблему

# «ЯНЫ НЕ ХОЧУЦЬ У ІНТЭРНАТ»

## Ці можа грамадства дапамагчы вярнуцца да нармальнага жыцця людзям пасля псіхічнага захворвання?

**Апошнім часам тэма псіхічных захворванняў падымаецца ўсё часцей і часцей, прычым у самых розных краінах. Магчыма, таму, што колькасць іх няўхільна расце. Па прагнозах Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, да 2020 года ў асобных краінах яны складуць 33% ад усіх захворванняў, а дэпрэсіўныя расстройствы выйдуць на другое месца пасля хвароб сардэчна-сасудзістай сістэмы. Што да Беларусі, то як адзначае Міністэрства аховы здароўя, колькасць выпадкаў псіхічных захворванняў за апошнія дзесяцігоддзі вырасла дзесьці на 20%. Як складваюцца лёсы такіх хворых і іх сем'яў у далейшым? І як можна ім дапамагчы зноў уліцца ў нармальнае жыццё?**



### Адпраўка чалавека ў псіханеўралагічны дом-інтэрнат — гэта яго грамадзянская смерць

**Колькасць псіхічных захворванняў у Беларусі за апошнія дзесяцігоддзі вырасла дзесьці на 20%.**

Калісьці ў Савецкім Саюзе з гэтай катэгорыяй пацыентаў асабліва не цырымоніліся. Пасля збору неабходных дакументаў іх адпраўлялі на пажыццёвае пасяленне ў спецыяльныя дамы-інтэрнаты.

З тых часоў многае ў нашым жыцці памянялася. Але, на жаль, гэта амаль не тычыцца людзей з псіхічнымі захворваннямі. Як адзначаюць эксперты, у дачыненні да іх у нашай краіне да гэтага часу пераважае медыцынскі падыход. Гэта значыць, што спробы лячыць сустракаюцца часцей за спробы папярэджваць хваробу, рэабілітаваць, займацца прафілактыкай інваліднасці па прыкмеце псіхічнага захворвання. Між тым псіхіятры кажуць, што сёння многіх іх пацыентаў можна вярнуць у грамадства. Новыя лекавыя сродкі дазваляюць зняць вострыя прыступы і дамагчыся ўстойлівай рэмісіі. Але ў грамадстве людзі з парушэннямі псіхічнага здароўя па-ранейшаму сутыкаюцца з неразуменнем і прадузятасцю. Грамадскія арганізацыі заяўляюць аб адсутнасці належнай сацыяльнай рэабілітацыі такіх людзей.

Апошнім часам гэтае пытанне больш клапоціць і дзяржаву. Можна казаць пра рост гуманізацыі грамадства, але не толькі. Тут ёсць яшчэ і эканамічны складнік: варта мець на ўвазе, што павелічэнне колькасці псіхічных расстройстваў мае прамы ўплыў на эканоміку. Псіхічныя захворванні прыкладна ў 26% выпадкаў прыводзяць да страты працаздольнасці, што цягне за сабой дадатковыя выдаткі дзяржавы.

— Утрыманне такіх пацыентаў у псіханеўралагічных дамах-інтэрнатах фінансуецца з дзяржаўнага бюджэту, — адзначае і **начальнік упраўлення стацыянарных установ сацыяльнага абслугоўвання і капітальнага будаўніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марыя ГАРБАЦЭВІЧ.** — Цяпер Мінпрацы і сацыяльнай абароны і аблвыканкамы працуюць над тым, каб туды паступала як мага менш пацыентаў і актывізаваліся сямейныя формы догляду за такімі людзьмі.

Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый акцэнтуюць увагу на тым, што змяшчэнне чалавека ў псіханеўралагічны дом-інтэрнат — гэта, фактычна, яго грамадзянская смерць, таму што ён ужо не можа нічым распараджацца, бо яго пазбаўляюць дзеяздольнасці.

— Судовае пасяджэнне з нагоды пазбаўлення дзеяздольнасці доўжыцца ўсяго 15 хвілін. За гэты час усе ўдзельнікі павінны паспець пагалбіцца ў пытанні псіхіятрыі, азнаёміцца са складанай жыццёвай сітуацыяй і прыняць узважанае рашэнне. Відавочна, што гэта фармальны падыход, арыентаваны выключна на псіхіятрычную экспертызу, — упэўнены **дырэктар Офіса па правах людзей з інваліднасцю Сяргей ДРАЗДОЎСКІ.** — На цяперашні момант апекуном такога недзеяздольнага з'яўляецца дырэктар самога інтэрната. Але наколькі рэальна ахапіць дырэктару пытанні апекі над усімі хворымі, якія пражываюць у інтэрнаце, якіх можа быць і 300, і 500 чалавек? Да таго ж сітуацыя, калі апякун адначасова выконвае адміністрацыйныя працэдуры над падапечным, з'яўляецца замкнёным колам. Апякун павінен звярнуцца да самога сябе, паскардзіцца самому сабе з нагоды неналежных мер у дачыненні да падапечнага?

Эксперты адзначаюць і той факт, што аднавіць дзеяздольнасць, як правіла, вельмі цяжка. Хоць часам чалавек прызнаецца недзеяздольным не ў сілу таго, што хворы, а з-за нейкіх сацыяльных фактараў. Бывалі выпадкі, што гэтага дамагаліся сваякі, якія потым завалодвалі жыллём такога чалавека.

— У нашых дамах-інтэрнатах пражывала ў 2011—2016 гадах каля 13 тысяч пацыентаў. Аднавілі дзеяздольнасць толькі 66 чалавек, — кажа Марыя Гарбацэвіч.

### Праз суправаджаемае пражыванне — да самастойнага жыцця

Як жа ўсё-такі паменшыць колькасць пастаяльцаў псіханеўралагічных дамоў-інтэрнатаў? Спецыялісты адзначаюць, што з чалавекам, які патэнцыйна можа выйсці з такой установы, трэба папярэдне працаваць. Яго трэба падрыхтаваць да жыцця па-за межамі дома-інтэрната, інтэграваць у грамадства. Эксперты сыходзяцца ў тым, што дапамагчы такім людзям развіць навыкі, неабходныя для ўваходжання ў нармальны свет, можа такая форма работы з імі як суправаджаемае пражыванне.

**Часам чалавек прызнаецца недзеяздольным не ў сілу таго, што хворы, а з-за нейкіх сацыяльных фактараў. Бывалі выпадкі, што гэтага дамагаліся сваякі, якія потым завалодвалі жыллём такога чалавека.**

І, як адзначаюць у Мінпрацы і сацыяльнай абароны, аддзяленні суправаджаемага пражывання ўжо адкрыты практычна ва ўсіх дамах-інтэрнатах псіханеўралагічнага профілю. Яны знаходзяцца як на тэрыторыі дамоў-інтэрнатаў, так і па-за іх межамі. Там пастаяльцы пражываюць самастойна і незалежна, аказваючы падтрымку адзін аднаму, — і пры мінімальным суправаджэнні з боку дзяржавы.

Такая сістэма больш выгадная для дзяржавы, паколькі ўтрыманне псіхіятрычных бальніц і інтэрнатаў псіханеўралагічнага профілю звязана з немалымі матэрыяльнымі выдаткамі.

Марыя Гарбацэвіч адзначае, што ў нашай краіне сёння сацыялізуецца такім чынам каля 1,5 тысячы чалавек. Яна звяртае ўвагу і на тое, што ў рамках рэалізацыі Нацыянальнага плана па рэалізацыі Канвенцыі аб правах інвалідаў прадугледжваецца распрацоўка пасады асістэнта інваліда, што таксама зможа дапамагчы такой катэгорыі інвалідаў жыць самастойна.

Што датычыцца дапамогі сям'і, у якой пражывае чалавек з псіхічным захворваннем, то Марыя Гарбацэвіч кажа : «Мы ўнеслі прапановы аб развіцці кароткатэрміновых паслуг, каб такім чынам разгрузіць сям'ю ад абавязкаў, якія ляжаць на ёй па доглядзе за псіхічна хворымі людзьмі». Тут гаворка ідзе ў першую чаргу пра такую паслугу як кароткатэрміновае знаходжанне. Па словах Марыі Гарбацэвіч, яна ўведзена ўжо досыць даўно. Сутнасць яе заключаецца ў тым, што сям'я можа часова змясціць хворага сваяка ў дом-інтэрнат на тэрмін да месяца. Каштуе гэтая паслуга нятанна, у межах 500 рублёў, але карыстаецца попытам, асабліва ў Мінску. Пры гэтым, як адзначае спецыяліст, тут не патрабуецца рашэнне суда аб пазбаўленні чалавека дзеяздольнасці.

9 лютага гэтага года была прынята пастанова Савета Міністраў №112, паводле якой хворага па жаданні сям'і можна змясціць у дом-інтэрнат на часовае пражыванне на тэрмін да года на платнай аснове і без пазбаўлення дзеяздольнасці. Гэта крок у бок захавання правоў чалавека з псіхічным захворваннем.

Акрамя таго, спецыялісты спадзяюцца на ўнясенне змяненняў у Грамадзянскі кодэкс і іншыя нарматыўныя акты, якія дадуць магчымасць альбо на частковы выхад з дамоў-інтэрнатаў такіх людзей, альбо на іх працаўладкаванне ў рамках пражывання ў дамах-інтэрнатах.

### Першыя «ластаўкі»

Спецыялісты адзначаюць, што многія маладыя людзі з псіхічнымі захворваннямі, якія жывуць цяпер з бацькамі, трывожацца, што з імі будзе, калі бацькі памруць. Яны не жадаюць трапляць у дом-інтэрнат, а хацелі б у такім выпадку мець магчымасць жыць у сваёй кватэры і атрымліваць дапамогу сацыяльнага работніка, якому яны давяраюць, і ведаць, што ў цяжкай сітуацыі, напрыклад, абвастрэння захворвання, яны змогуць разлічваць на падтрымку.

«Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам» з 2009 года рэалізуе паслугу навучальнага суправаджаемага пражывання на базе трэніровачнай кватэры «Адчыненыя дзверы». Для такога пражывання былі абсталяваны дзве сумежныя двухпакаёвыя кватэры ў адным са звычайных шматпавярховікаў Мінска. У іх селяцца маладыя людзі з разумовымі абмежаваннямі. Днём яны наведваюць майстэрні грамадскіх і царкоўных арганізацый альбо майстэрні тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. А пасля заканчэння работы ў майстэрнях вяртаюцца ў гэты так званы інтэрнат, дзе іх сустракаюць спецыялісты па сацыяльнай рабоце. Такое навучальнае суправаджаемае пражыванне дапамагае маладым людзям развіць навыкі, неабходныя для жыцця, вучобы і працы з найменшым аб'ёмам прафесійнай дапамогі.

**Цяпер у свеце налічваецца 47 млн людзей з дэменцыяй. Больш за 300 млн пакутуюць на дэпрэсію.**

У Мінску цяпер пражывае каля 11 тысяч людзей з дыягназам «псіхоз», з іх каля 4500 маюць дыягназ «шызафрэнія». На сёння гэтая катэгорыя людзей засталася па-за полем дзейнасці сацыяльных службаў: альбо лячэнне ў клініцы і пры дыспансеры, альбо адпраўка ў псіханеўралагічны дом-інтэрнат пасля пазбаўлення дзеяздольнасці.

Аднак у 2011 годзе па ініцыятыве «Беларускай асацыяцыі сацыяльных работнікаў» у сталіцы з'явіўся першы Клубны дом «Адкрытая душа» — своеасаблівая сацыяльная служба для людзей з псіхічнымі захворваннямі, якая дазваляе арганізаваць жыццё па-за межамі бальніцы, аднавіць згубленыя навыкі і вярнуцца да актыўнага жыцця ў грамадстве, а па магчымасці — і да працы. За гэты час членамі клубнага дома сталі 122 чалавекі — жыхары Мінска і Мінскага раёна з псіхічнымі захворваннямі. Гэта людзі з рознымі жыццёвымі гісторыямі, але аб'яднаныя жаданнем пераадолець наступствы хваробы і жыць актыўна і шчасліва...

**Святлана БУСЬКО.**
busko@zviazda.by

### ❍ У ТЭМУ

### ЯК ПАДТРЫМАЦЬ ЛЮДЗЕЙ З ДЭМЕНЦЫЯЙ І ІХ СЕМ'І?

**Доля жыхароў Беларусі ва ўзросце 65 гадоў і старэй па звестках апошняга перапісу насельніцтва склала 14,2%, а па прагнозных паказчыках Міністэрства эканомікі Беларусі ўжо да 2020 года можа дасягнуць 27%. Следствам гэтага можа стаць і хуткі рост колькасці пажылых людзей з рознымі формамі дэменцыі. Ужо сёння гэтая хвароба штогод дыягнастуецца ў 3,5—4,5 тысячы пажылых людзей. У выніку хтосьці з блізкіх сваякоў вымушаны пакінуць работу альбо працаваць на ўмовах няпоўнай занятасці, каб мець магчымасць даглядаць за такім сваяком.**

Каб дапамагчы такім сем'ям, грамадская дабрачынная яўрэйская арганізацыя «Хэсэд-Рахамім» і Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа пачалі рэалізацыю праектаў, накіраваных на адпрацоўку мадэляў падтрымкі людзей, якія жывуць з дэменцыяй, і іх сем'яў.

«Хэсэд-Рахамім» апрабуе стварэнне і функцыянаванне дзённага цэнтра/аддзялення для людзей, якія маюць кагнітыўныя парушэнні або якія жывуць з дэменцыяй у Мінску і Бабруйску. Яго галоўная задача — падоўжыць здольнасць такіх людзей жыць у звыклым для іх асяроддзі і па магчымасці замарудзіць развіццё хваробы, а таксама навучыць членаў сем'яў гарманічна кантактаваць за сваімі пажылымі сваякамі і правільна даглядаць іх.

Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа збіраецца ў тэставым рэжыме апрабаваць і прапанаваць мадэль медыка-сацыяльнага догляду дома за людзьмі, якія жывуць з дэменцыяй. Праект рэалізуецца ў Гродзенскай вобласці.

Праекты запланаваны на два з паловай гады і будуць ажыццяўляцца пры экспертнай падтрымцы НДІ працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў садружнасці з нямецкімі партнёрамі і беларускімі грамадскімі і дзяржаўнымі арганізацыямі. У ходзе іх рэалізацыі таксама будуць арганізаваны серыі семінараў, інфармацыйных сустрэч і стажыровак для зацікаўленых дзяржаўных і грамадскіх арганізацый.



## «ЗАМУЖ ВЫЙСЦІ — НЕ НАПАСЦЬ...»

Калі я вучылася ў школе, мая мама любіла паўтараць: «Любоў зла, палюбіш і казла», а таксама «Замуж выйсці — не напасць, абы замужам не прапасць». Тады я, чарговы раз закаханая па вушы, толькі адмахвалася. Цяпер жа, гледзячы, як некаторыя мае ранейшыя кавалеры спіліся, скончылі жыццё самагубствам ці маюць пазашлюбных дзяцей, разумею, што мама мела рацыю...

На днях да мяне на гарбатку забегла таварышка, з якой даўно не бачыліся. Слова за словам, разгаварыліся пра бацькоў. «Мне так шкада мамы, — уздыхнула Марынка. — Гляджу на яе і разумею, як усё ж такі важна для жанчыны паспяхова выйсці замуж». Тата маёй сяброўкі зусім не алкаголік, як я падумала адразу. Ён — працаголік. «І я нават не ведаю, што горш, — працягвае дзяўчына. — Уяўляеш, ён штогод засаджвае ўсе агароды бульбай. Акрамя таго, у нас гадуюцца дзве каровы, гусі, індыкі, куры, качкі, свінні... Тры вялікія маразілкі стаяць у хаце, пад завязку запоўненыя мясам. А тата яшчэ двух парасят купіў. Бо бульба засталася, маўляў, «не выкідаць жа...» Я яшчэ зразумела б, калі б ён сам з усім гэтым упраўляўся. Дык не, займаецца толькі бульбай. Уся ж жыўнасць ляжыць на мамчыных плячах, а ёй жа яшчэ трэба і паесці прыгатаваць, і ў хаце прыбрацца. Матуля ж мая вельмі творчая, любіць вышываць, вязаць. Але робіць гэта ўпотай, бо як тата ўбачыць яе з пяльцамі ці пруткамі ў руках, адразу мацюкамі пачынае сыпаць «Што ты х... займаешся! Хіба работы табе няма!» Яе сяброўкі выкладаюць сваю вышыўку ў інтэрнэце, хваляцца тым, што асвоілі новыя тэхнікі. А яна не можа... З-за цяжкай фізічнай працы, з-за мужа-дыктатара...»

У падобную сітуацыю трапіла і баба Маня. Яе муж аказаўся мала таго, што працаголікам, дык яшчэ і скнарам, якіх пашукаць трэба. Але ж яна цярпела, бо кахала... Кожнае лета год за годам дапамагала яму сушыць сена для каня Буланчыка ды трох рагуляў. Праўда, практычна ўсе грошы за здадзенае малако гаспадар забіраў сабе. «Я ж нават унучкам з пенсіі капейчыну давала ўпотай. Не дай божа ўбачыў бы, жыцця мне ў хаце не было б. У выніку, тыя «малочныя» грошы з'елі мышы. Муж застаўся ні з чым. А калі я аслабла ад такой вымотваючай штодзённай працы і пачала хварэць, кінуў мяне. Кажуць, што знайшоў сабе ў іншай вёсцы крыху маладзейшую, якая магла працаваць. Так вось бывае ў жыцці — быў муж, ды аб'еўся груш».

Нядаўна ў парку маю ўвагу прыцягнула неверагодна прыгожая пара. Бабуля з дзядулем павольна ішлі за ручку, размаўлялі аб нечым сваім, бы закаханыя галубкі. Яны з такой цеплынёй і пяшчотай пазіралі адно на аднаго! Я не стрымалася і запыталася, як яны змаглі пранесці праз столькі гадоў сваё каханне. «Берагчы трэба адно аднаго. Я ўсё жыццё думаў: што ж магу зрабіць, каб маёй Сонечцы было хоць крыху лягчэй, а яна — каб мне», — падзяліўся такім простым, але такім важным сакрэтам дзядуля.

У адной вёсачцы жыў адзінокі стары чалавек. Ён любіў усіх суседскіх дзяцей і праводзіў з імі шмат часу. Яшчэ ён любіў рабіць ім падарункі, але дарыў толькі крохкія рэчы. Як ні стараліся малыя быць акуратнымі, іх новыя цацкі ўсё адно ламаліся. Дзеці пераживалі і горка плакалі. Праходзіў нейкі час, стары зноў дарыў ім цацкі, але яшчэ больш крохкія. Аднойчы бацькі не вытрымалі і прыйшлі да яго:

— Ты мудры і жадаеш нашым дзецям толькі дабра. Але навошта робіш ім такія падарункі? Яны берагуць іх, як могуць, але цацкі ўсё адно ламаюцца, і дзеці плачуць.

— Пройдзе зусім няшмат гадоў, — усміхнуўся стары, — і хтосьці падорыць ім сваё сэрца. Можа быць, мае крохкія цацкі навучаць іх абыходзіцца з гэтым бясцэнным дарам хоць трохі больш акуратна?

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

Сямейная газета

Выпуск №14 (81)

■ Вольны час

# АТРАКЦЫЁНЫ ДЛЯ МІЛЬЁНАЎ

## НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ ПРАГУЛЯЛІСЯ ПА ПАРКУ З ЧАЛАВЕКАМ, ЯКІ ВЕДАЕ ПРА СТАЛІЧНЫЯ КАРУСЕЛІ ЎСЁ



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ 50+: жыць цікава

# «ПРАВОДЗІШ ПА СТРУНАХ — І ДЫХАЦЬ ЛЯГЧЭЙ»

**На выхадных, гуляючы па Віцебску, яшчэ здалёк пачула гукі гусляў. Калі падышла бліжэй — убачыла незвычайнае трыа, якое радавала мінакоў вясёлымі прыпеўкамі. Выступленне гэтых мілых артыстаў, якіх вы бачыце на фотаздымку, я запісала на тэлефон (паглядзець яго можна на нашым сайце www.zviazda.by). І, вядома, не ўтрымалася — пазнаёмілася з імі.**



Фота Надзеі ДРЫЛЫ.

— Ведаеце, нам песня жыць дапамагае, — кажа старэйшая з гусляроў Галіна Аляксандраўна Немізанская. — Нездарма кажуць: «Гуслі звіняць — душу маладзяць». А то сядзіш дома, то там кальне, то тут. А выйдзеш у людзі, возьмеш у рукі інструмент, зацягнеш вясёлую песню — і боль як рукой зняло. Мы ўжо ў такім узросце, калі дома не вельмі камфортна сядзець увесь час. А некаторым дома некамфортна наогул. ...Нават калі проста вадзіць па струнах *(праводзіць рукой зверху ўніз)*, і то дыхаць лягчэй. Чуеце, якія гукі цудоўныя?

Гусляры расказалі, што іх ансамбль называецца «Садко». Ён яшчэ зусім малады, існуе пры «Залатым кальцы» (культурна-гістарычны комплекс «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна») усяго два гады.

— Згуртавала нас вакол сябе Ганна Паўлаўна Кавалёва. У свае 75 гадоў яна надзвычай актыўная і маладая душой. Сёння яе з намі, на жаль, няма. Па сямейных абставінах вымушана была застацца дома. За два гады мы развучылі шмат нумароў. Ужо даём канцэрты па паўтары гадзіны. Але без Ганны Паўлаўны нам цяжкавата вялікую праграму зрабіць.

***— Цікава, як вы пазнаёміліся паміж сабой?***

— Нас звязаў народны ансамбль «Ліра», — усміхаецца Галіна Аляксандраўна. — Мы з Тамарай там спяваем ужо гадоў дзесяць, а Ганна Паўлаўна грае на домры.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

# ЖАНЧЫНА. НЕМАЎЛЯ. АДЧАЙ



## «Шчаслівы малыш» дапамагае мамам, каб у краіне не з'яўляліся новыя сіроты

**«Можаце сабе ўявіць сітуацыю, калі ляжыш зімой з тэмпературай пад 40, а тваё немаўля плача ад голаду? І ты тэлефануеш бацьку дзіцяці, свайму грамадзянскаму мужу, і просіш: «Прынясі хоць хлеба»! А ён адказвае: «Табе патрэбны толькі грошы», і тут жа забывае пра тваю просьбу...», — у 27-гадовай Веры на вочы навarочваюцца слёзы, хоць яна ўспамінае сітуацыю трохгадовай даўнасці. Тады ёй здавалася, што яна на самым краі: «Я зноў зацяжарыла, а ён кудысьці знік. Дайшло да таго, што не было на што купіць калготы...» У сектары аховы дзяцінства Веры сказалі, што яе дзеці (на той момант яна ўжо нарадзіла другое дзіця) — кандыдаты на паступленне ў прытулак. «Але я не хачу пазбаўляцца сваіх малютак, я люблю іх!» — плакала Вера. Яе захліставў адчай...**

### «Яны не кажуць тое, што ты хочаш пачуць...»

Хтосьці са знаёмых літаральна за руку прывёў маладую жанчыну ў сацыяльны цэнтр «Шчаслівы малыш». Там яе ўважліва выслухалі і прапанавалі сваю дапамогу. «Спачатку мне дапамагалі рэчамі, давалі прадуктовыя наборы. Тэлефанавалі і прапаноўвалі нам са старэйшай дачкой бясплатныя білеты ў тэатр, у дэльфінарый, — расказвае Вера. — Даведаўшыся, што я захапляюся вырабам біжутэрыі, аплацілі адпаведныя курсы, каб я магла крыху зарабляць...»

Псіхолагі цэнтра дапамаглі ёй выйсці з дэпрэсіі. «Яны не кажуць тое, што ты хочаш пачуць — яны кажуць, як бачаць сітуацыю збоку, — дзеліцца Вера. — Спачатку пад уздзеяннем моцных эмоцый ты з імі не пагаджаешся, але потым, калі супакоішся, узважваеш іх словы... і пачынаеш глядзець на сваё жыццё крыху па-іншаму...» Вера па гэты дзень ходзіць у «Шчаслівы малыш». Тут цяпер збіраюцца групы самадапамогі. Прыходзяць маладыя мамы, хтосьці выбраўся з цяжкай сітуацыі — і дзеліцца сваім вопытам, дае парады іншым. Сядзяць разам за гарбатай, размаўляюць...

Хэпі-энд? Складанасцяў жыцця ніхто не адмяніў. Веры трэба адной гадаваць дваіх маленькіх дзяцей. Але яна цяпер значна больш упэўненая ў сваіх сілах, не сумняваецца, што справіцца. Самае галоўнае, яе дзеці засталіся з ёю, а не патрапілі ў прытулак. І, дарэчы, менавіта пасля размоў з псіхолагам цэнтра, пакутлівых прыкідак «за» і «супраць» Вера прыняла рашэнне канчаткова разысціся з бацькам дзяцей, зразумеўшы, што так будзе лепш і для яе, і для сына з дачкой.

...Бываюць розныя сітуацыі ў жыцці, бывае вельмі складана, і тады надыходзіць адчай. А калі ў гэтым свеце ты сам-насам са сваімі праблемамі, калі няма сваякоў, калі няма побач мамы, якая заўсёды дапаможа як справай, так і парадай, калі проста няма за што накарміць дзіця... Жанчына вельмі ўразлівая, калі яна адна з маленькім дзіцем. Пражыць толькі на дзіцячую дапамогу вельмі складана, і, бывае, нават проста няма з кім пакінуць малечу, каб схадзіць у аптэку ды краму... На шчасце, калі здараецца бяда ці складаная сітуацыя — эканамічная, сацыяльная, псіхалагічная — мацярынскі інстынкт знікае далёка не заўсёды і не ва ўсіх. Большасць жанчын, адчуваючы сваю адказнасць за дзяцей, стараюцца знайсці нейкае выйсце. Менавіта для такіх выпадкаў і працуе сталічны сацыяльны цэнтр «Шчаслівы малыш». Бо лягчэй прадухіліць з'яўленне яшчэ адной сіраты, чым потым загойваць душэўныя раны дзіцяці і шукаць яму новую сям'ю.

**«Калі ў вас заваленыя шафы, можа, некаторыя вашы рэчы маглі б знайсці новага ўдзячнага ўладальніка? — карыстаючыся выпадкам, звяртаецца да нашых чытачоў сацыяльны педагог цэнтра Кацярына Сідарук. — Нам спатрэбіцца ўсё: посуд, коўдры, падушкі, ручнікі, дзіцячыя рэчы». (Тэл. сацыяльнага цэнтра «Шчаслівы малыш» — +375 17 222 05 65.)**

### «Часам дзяўчына хоча захаваць дзіця, а яе бацькі пішуць заяву аб адмове»

— Мы дапамагаем маладым мамам ва ўзросце да 35 гадоў, цяжарным з рызыкай адмовы ад дзіцяці, а таксама жанчынам з дзіцем або дзецьмі, хоць аднаму з якіх менш за тры гады, — кажа **дырэктар цэнтра «Шчаслівы малыш» Ірына ШМАК.** — Такія цэнтры існуюць ва ўсіх еўрапейскіх краінах. Галоўная наша мэта — прафілактыка ранняга сацыяльнага сіроцтва ці, кажучы простай мовай, — каб дзеці заставаліся са сваімі бацькамі нягледзячы на складаную жыццёвую сітуацыю, у якой апынулася сям'я. Хто канкрэтна звяртаецца па дапамогу? Часта гэта жанчыны, якія зацяжарылі, іх кінуў мужчына, і яны засталіся наогул адны, без якой-небудзь дапамогі. Напрыклад, гэта маладыя дзяўчаты, якія самі выхоўваліся ў дамах-інтэрнатах. Ёсць і дзяўчаты, якім бацькі адмаўляюць у падтрымцы: твае праблемы, спраўляйся з імі сама. І гэта яшчэ добра. Бываюць выпадкі, калі пасля таго, як нараджае непаўналетняя дзяўчына, якая па законе яшчэ не мае права самой прымаць рашэнне, — яе бацькі пішуць заяву аб адмове ад гэтага дзіцяці. Атрымліваецца, дзяўчына хоча захаваць дзіця і выгадаваць яго, а яе маці ці тата прымаюць вось такое рашэнне. На шчасце, часцей за ўсё такіх бацькоў удаецца пераканаць. Былі выпадкі, калі потым яны прыходзяць і казалі: дзякуй, што мы не зрабілі гэтую памылку...

**Сацыяльны цэнтр «Шчаслівы малыш» быў створаны ў 2013 годзе SOS-Дзіцячай вёскай Бараўляны і з'яўляецца яе падраздзяленнем. Пачынаўся ён як пілотны праект для чатырох раёнаў Мінска, дзе пражывае найбольшая колькасць маладых сем'яў. За больш чым 4 гады сваёй работы ён дапамог больш як 400 дзецям. З мінулага года ў «Шчаслівы малыш» могуць звяртацца маладыя мамы з усяго горада.**

Звяртаюцца ў «Шчаслівы малыш» і дзяўчаты, якія ў сілу жыццёвых акалічнасцяў не маюць у Мінску ўласнага жылля. Пасля таго, як яны зацяжарылі і на позніх тэрмінах ужо не могуць працаваць, некаторыя з іх пазбаўляюцца здымнага жылля, бо не ў стане плаціць за яго. Гэта значыць — фактычна аказваюцца на вуліцы. І калі такой жанчыне няма куды паехаць пасля родаў, то дзіця павінна застацца ў радзільным доме: яго не могуць выпісаць у нікуды. Але ў жыцці бываюць розныя сітуацыі, бывае, што дом прададзены або згарэў, або ў ім жывуць сваякі-алкаголікі і вярнуцца туды немагчыма...

— Калі яны прыходзяць да нас, мы накіроўваем іх у кватэру для часовага пражывання маладых мам, — тлумачыць Ірына Шмак. — Гэта месца з чатырма жылымі пакоямі, агульнай гасцінай, кухняй і двума санвузламі — для мам з дзецьмі, якія апынуліся ў экстрэмальнай сітуацыі. Там яны могуць знаходзіцца да паўгода. Часам, калі абставіны не палепшыліся, мы можам падоўжыць гэты тэрмін да года.

Многія маладыя мамы не ведаюць, як даглядаць дзіця, таму ў сацыяльным цэнтры праводзяць навучальныя трэнінгі па правільным харчаванні, грудным гадаванні. Ёсць у гэтым цэнтры і «чароўная шафа» з рэчамі першай неабходнасці. Гэта дзіцячыя распашонкі, штонікі, коўдры, цацкі, падгузнікі, ванначкі, а таксама вітаміны для дзяцей і цяжарных жанчын, адзенне для сябе...

Спачатку цэнтр атрымліваў гуманітарную дапамогу з-за мяжы. Цяпер ужо раздае прадметы першай неабходнасці, якія сабраны беларусамі. «Калі ў вас заваленыя шафы, можа, некаторыя вашы рэчы маглі б знайсці сабе новага ўдзячнага ўладальніка? — карыстаючыся выпадкам, звяртаецца да нашых чытачоў **сацыяльны педагог цэнтра Кацярына СІДАРУК.** — Нам спатрэбіцца ўсё: посуд, коўдры, падушкі, ручнікі, дзіцячыя рэчы».

А яшчэ з маладымі маці ў «Шчаслівым малышу», як і з Верай у свой час, працуюць псіхолаг і сацыяльны педагог. І іх падтрымка вельмі запатрабаваная. Пры неабходнасці сацыяльны цэнтр прыцягвае для дапамогі мамам яшчэ і юрыстаў, дэфектолагаў, сацыяльных работнікаў, псіхатэрапеўтаў...

**Жанчына вельмі ўразлівая, калі яна адна з маленькім дзіцем. Пражыць толькі на дзіцячую дапамогу вельмі складана, і, бывае, нават проста няма з кім пакінуць малечу, каб схадзіць у аптэку ды краму...**

Спецыялісты цэнтра рыхтуюць і валанцёраў, якія потым адпраўляюцца дапамагаць у Дом дзіцяці. Для іх праводзяць серыю заняткаў, на якіх расказваюць пра асаблівасці тых дзетак, што знаходзяцца ў дзіцячых установах, таму што яны адрозніваюцца ад дамашніх. І да гэтага трэба быць гатовым, каб не захлынуцца слязьмі ад жалю ці, наадварот, сваёй ганарыстасцю, маўляў, які я выдатны, адзін раз прыйшоў пагуляць з кінутымі дзецьмі... Вучаць яны валанцёраў акрамя ўсяго іншага яшчэ і таму, што трэба больш абдымаць такіх малых, бо ім гэтага востра не хапае. Таму ў «Шчаслівым малышу» ўпэўнены: нават самая праблемная мама для дзіцяці лепш, чым дзіцячы дом.

**Святлана БУСЬКО.**
busko@zviazda.by

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ТАТАВЫ КАДРЫ

**Гартаем сямейны альбом у хаце Лізаветы Акімаўны Капытковай з вёскі Вялікі Нежкаў Бялыніцкага раёна. Каб прагледзець кожны здымак і пачуць гісторыю, якая з ім звязана, спатрэбіцца тыдзень, а можа, і два. Фатаграфія — хобі мужа-нябожчыка Мікалая Міхайлавіча Лындова, з якім у шлюбе пражылі 65 гадоў, выгадавалі сямёра дзяцей.**

— Пасля таго як скончыла школу, вырашыла стаць педагогам, — расказвае Лізавета Акімаўна. — Увогуле з усіх нашых блізкіх і далёкіх родных прафесію настаўніка выбрала каля 20 чалавек.

І я прадоўжыла дынастыю, скончыла педагагічнае вучылішча ў Магілёве. Потым паступіла на фізіка-матэматычны факультэт пединстытута. Там пазнаёмілася са сваім будучым мужам.

У Нежкаве бацькі дапамаглі маладой сям'і купіць дом.

Так, у мясцовай школе Лізавета Акімаўна стала выкладаць матэматыку, а Мікалай Міхайлавіч — гісторыю і пачатковую ваенную падрыхтоўку. А яшчэ — гурток па фатаграфаванні. Спадар Лындоў практычна не расставаўся з фотаапаратам і шчодра дзяліўся здымкамі з вялікай раднёй.

За шматгадовую і добрасумленную працу Лізавету Капыткову ўзнагародзілі медалём «Ветэран працы». Але найбольшы гонар жанчыны — мацярынская кніжка, куды занесены дарагія сэрцу імёны яе дзяцей: Наталлі, Таццяны, Уладзіміра, Ірыны, Міхаіла, Сяргея, Аляксандра. Усе яны выраслі добрымі людзьмі, уладкаваліся ў жыцці. У Лізаветы Акімаўны зараз 13 унукаў, 7 праўнукаў і 2 прапраўнукі.



Мікалай ЛЫНДОЎ практычна не расставаўся з фотаапаратам.



Сяргей і Саша дапамагаюць бацькам пілаваць дровы (здымкі зроблены з разыходжаннем у 10 гадоў).

Мы разглядаем фотакарткі, і я раптам заўважаю дзве падобныя. На іх сыны Лізаветы Акімаўны і Мікалая Міхайлавіча — Сяргей і Саша — пілуюць дровы. Здымкі зроблены з разыходжаннем у 10 гадоў. Дзеці ніколі не адмаўляліся дапамагчы па гаспадарцы, працавалі дружна, і бацьку неадноўчы ўдавалася зрабіць кадры для гісторыі.

Ужо тры зімы запар Лізавета Акімаўна гасцюе ў дзяцей у горадзе, а летам вяртаецца ў родную хату. Тут яе чакаюць дарагія сэрцу фотаздымкі і кнігі, якія з'яўляюцца яшчэ адным захапленнем іх сям'і. Дамашнюю бібліятэку з найлепшых твораў сусветнай, рускай і беларускай літаратуры збіралі з усіх куткоў былога Савецкага Саюза.

**Святлана МАГІЛЕЎЧЫК** ■

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з невялікай гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

# «ПРАВОДЗІШ ПА СТРУНАХ — І ДЫХАЦЬ ЛЯГЧЭЙ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

— Ганна Паўлаўна ў нас прафесіянал, яна шмат на чым грае: і на балалайцы, і на мандаліне, і на гуслях... — падхоплівае Тамара Канстанцінаўна Маўчанава.

— Калі яна сказала, што можа навучыць нас граць на гуслях, мы адразу ж пагадзіліся, — працягвае Галіна Аляксандраўна. — Паўгода кожны дзень з Тамарай прыязджалі да яе на заняткі. Так нам падабаюцца гуслі! Прычым ні ў каго з нас, акрамя Ганны Паўлаўны, няма музычнай адукацыі. Прынамсі, я 30 гадоў адпрацавала рэжысёрам на Віцебскім абласным тэлебачанні, у дзіцячай рэдакцыі.

Спачатку выступалі ўтрох. Пакуль лёс не прывёў у «Залатое кальцо» Аляксандра.

— Ён, калі прыйшоў, узяўся за гуслі і адразу зайграў. І спявае цудоўна. І на фартэпіяна можа падабраць амаль любую мелодыю на слых і па нотах. А на лыжках, паглядзіце, як віртуозна грае, і на трашчотцы ды на рублі. Ну, мы сёння без яго як без рук.

— Я ў свой час скончыў музычную школу, — сціпла ўсміхаецца Аляксандр Эзрыль. — Але пасля жыццё не было звязана з музыкай. 25 гадоў адпрацаваў у дэпо. А на пенсію выйшаў, зноў прачнуўся інтарэс да інструментаў.

***— А адкуль у вас гуслі?***

— Гуслі нам падарыў Віцебскі каледж мастацтваў. Яны ўжо старэнькія, спісаныя. Але ўсё адно мы вельмі задаволеныя, — кажа Галіна Аляксандраўна. — ...А як вам нашы з Тамарай накідкі? Іх нам зрабіла жонка Аляксандра. Вось такія ў нас людзі падабраліся.

***— Яна таксама з вамі выступае?***

— Не. Хоць мы яе клікалі. Яна дамашняя, тым больш у яе ўнучак нядаўна нарадзіўся.

— І спявае ж нядрэнна, — дадае Аляксандр. — Мая жонка на ўсе рукі майстар: і шые, і вяжа, і гатуе цудоўна. Проста яна надта сціплы чалавек.

— Але ходзіць да нас на канцэрты, — працягвае Галіна Аляксандраўна. — Сваякі падтрымліваюць наша захапленне. Дачка мая, напрыклад, здымае відэаролікі, а пасля апрацоўвае іх у адмысловай праграме і выкладае ў інтэрнэт, каб нас пачула вялікая колькасць людзей.

***— А дзе яшчэ можна пачуць вашы выступленні?***

— Падчас свят нас просяць выступіць на вуліцах горада. Ходзім са сваімі канцэртамі і ў бібліятэкі, школы. Тэмы ў нас розныя. Можам зараз вам прыпеўкі праспяваць менавіта на ваенную тэму. Такіх вы дакладна нідзе не пачуеце! А нядаўна ў бібліятэцы імя Леніна адзел замежнай літаратуры ладзіў лекторый пра чай. Там былі кітайцы, японцы, у Віцебску вельмі шмат нацыянальнасцяў пражывае. Дык вось мы там спявалі прыпеўкі пра беларускі чай — гарбату. Збірае іх у нас Тамара ў асноўным. У яе на любую тэму абавязкова знойдзецца прыпеўка.

***— А вы толькі па-руску спяваеце?***

— Не, у нас і беларускамоўных кампазіцый вельмі шмат. «Ой, дзяўчына, шуміць гай», «Мае вочы чорныя»... Хочаце, зараз праспяваем? *(Спяваюць.)*

Пасля выступлення да гусляроў падышла бабуля з двума ўнукамі. Сказала, што ёй вельмі падабаюцца гукі гусляў. «Дык вы да нас прыходзьце, у ансамбль, — усміхаецца Галіна Аляксандраўна. — Навучым і вас на гуслях граць. І вы *(звяртаецца ўжо да мяне)* напішыце ў «Звяздзе», што, калі хтосьці ў Віцебску нудзіцца дома, то няхай да нас прыходзяць, мы рады ўсім».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.** nadzieja@zviazda.by

*Мінск — Віцебск.*

■ Кранальнае

# Як пахне грыб

Дзядуля Мікалай быў у вёсцы майстар на ўсе рукі. Але мелася ў яго з маладосці адно галоўнае захапленне — грыбы. Як толькі для гэтага наступала спакуслівая пара, дзед першы падаваўся з кошыкам і кіем у лес. Ён ведаў кожнае дрэўца, кожны кусцік і ніколі, нават у самыя неспрыяльныя гады, не вяртаўся без здабычы. Не сказаць, каб дзядуля любіў тыя баравікі есці, але не збіраць іх проста не мог.

Дзеда Міколу часта прасілі знаёмыя і сваякі завесці ў лес, дзе можна набраць грыбоў. Напачатку вадзіў. Але як толькі яны траплялі ў яго любімае месца, дзед тут жа выкрэсліваў яго са спісу сваіх любімых і больш туды не паказваўся. І дзесьці меў рацыю: знаёмы прыводзіў у такое месцейка сваіх сваякоў, тыя сваіх знаёмых, і на наступны год там ужо грыбы не раслі.

Таму і хадзіў дзядуля Мікола ў грыбы адзін, ранкам, калі расаззяе на павуцінні. Ішлі гады, дзядуля старэў, а аднойчы замуцілася ў галаве, ледзь дарогу назад знайшоў. І вырашыў стары сваё захапленне і майстэрства перадаць адзінай унучцы. Папрыглядаўся дзед Мікола да малой і папрасіў у бацькоў дазволу ўзяць у лес шасцігадовую Настачку.

Заехалі на веласіпедзе ў самае грыбное дзедава месца. Ён накіраваў малую, каб ёй цікава было, да першага грыба, які заўважыў. І кажа: «Унучка, чую я — тут пахне грыб. Давай пашукаем, даражэнькая». Тая стала прыглядацца, але прайшла міма. А хітры дзед ізноў па той дарожцы завярнуў, яшчэ бліжэй да грыба. Малая за ім. Ён спыніўся, пастаяў, нібы думаў, куды б падацца, а на самай справе хацеў, каб малая запаволіла хаду і стала лепш прыглядацца. І праз колькі хвілін пачуў ззаду радасны крык: «Дзядуля! Дзядулечка, ты прапусціў баравік. Глядзі, глядзі, а я яго знайшла». Малая ад радасці не ведала з якога боку танцаваць перад лясным прыгажуном, а калі баравік лёг у яе кошык, сур'ёзна дадала: «Дзядулечка, ты не хвалюйся, я і табе дапамагу знайсці баравік».

Дзед ад яе шчырых і такіх непасрэдных слоў квітнеў. Яшчэ шмат разоў ён адчуваў задавальненне ад радасці ўнучкі. Спрытная дзедава Настачка хутка стала збіраць грыбы нароўні з дзедам. А падрасла, у яе сталі іншыя інтарэсы. І дзед зноў стаў хадзіць у лес у адзіноце. Ён не крыўдаваў на ўнучку, разумеў, што вучыцца ёй трэба.

І вось Настачка паступіла ва ўніверсітэт. Паехала ў вялікі горад. А ў першыя выхадныя прыляцела птушачкай дадому. Убачыла дзеда, кінулася яму на шыю і радасна зашчабятала: «Дзядуля, родненькі, я такая шчаслівая буду, калі мы пойдзем з табой у грыбы. Мне так хочацца ў лес».

Стары анямеў ад шчасця: Настачка не забылася яго навуку. Ён хацеў гэтак жа радасна адказаць: «Пойдзем, даражэнькая, вядома, пойдзем», але ў грудзях засеў быццам кол, які сцяў і горла. І тады стары ўзяў за плечы ўнучку і затрос сваёй сівой галавой у знак перапаўняючай сэрца згоды.

**Валянціна БОБРЫК,**
*г. Івацэвічы* ■



# АТРАКЦЫЁНЫ ДЛЯ МІЛЬЁНАЎ

**Лета не лета, калі не пабываў у парку атракцыёнаў. Пажадана, у кабінцы «Супер-8». Хоць, як аказалася, кола агляду па многіх параметрах дасць фору амерыканскім горкам. Калі ў сталічных парках з'явяцца новыя каруселі? Ці дачакаюцца беларусы свайго Дыснейленду? І як гэта — быць першым, хто апрабоўвае атракцыёны? Пра гэта мы даведаліся ў галоўнага інжынера Мінсказеленбуда Уладзіміра БАБІЎСКАГА. Пад яго адказнасцю знаходзяцца каруселі чатырох сталічных паркаў — Цэнтральнага дзіцячага парка імя М. Горкага, паркаў імя Чалюскінцаў, імя 900-годдзя Мінска і імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Уладзімір БАБІЎСКІ ведае пра сталічныя атракцыёны ўсё.

## Марыў стаць ваенным

З Уладзімірам Бабіўскім мы сустракаемся ў Цэнтральным дзіцячым парку імя М. Горкага, найстарэйшым са сталічных паркаў атракцыёнаў.

***— Марылі ў дзяцінстве працаваць на каруселях?***

— Не, — смяецца мужчына. — Ніколі не звязваў сваё дзяцінства і юнацтва з гэтым. Марыў стаць машыністам, леснікам, лётчыкам. Тата быў ваенным, таму ваенным я таксама хацеў быць.

**«Самая дарагая карусель у сталіцы — кола агляду ў парку Горкага».**

Мара гэта ў нейкай ступені спраўдзілася. Уладзімір — кадравы афіцэр, падпалкоўнік запасу. А галоўным інжынерам у Мінсказеленбудзе ён працуе з 2014 года. Адна з вышэйшых адукацый Уладзіміра — якраз інжынерна-тэхнічная.

***— Памятаеце атракцыёны свайго дзяцінства?***

— Калі быў маленькі, ездзілі з бацькамі на мора. І там была такая карусель «Сюрпрыз». І, вядома, атракцыёны з песні «Лепрыконсаў» — «Халі-галі», «Парашутрупер». Электрамабілі любіў. А яшчэ кола агляду. У кожным горадзе, дзе бываў у дзяцінстве, абавязкова бацькі вадзілі на яго. Гэта быў самы экстрэмальны атракцыён на тыя гады.

Кола агляду, дарэчы, і цяпер любімы атракцыён галоўнага інжынера. Праўда, катаецца ён вельмі рэдка: не хапае часу. Выключэнне — сезон запуску атракцыёнаў, красавік, калі трэба апрабаваць каруселі перад пачаткам эксплуатацыі.

***— Не страшна быць першым?***

— Калі баяцца, трэба сядзець дома пад коўдрай, — жартуе ў адказ Уладзімір Бабіўскі. — У мяне ёсць і міжнародны вопыт, я бачыў шмат розных атракцыёнаў. Сказаць, што нейкі мяне ўзрушыў, — не, такога не было. Акрамя, напэўна, скачкоў у бездань — роўп-джампінгу.

## «Тэст-драйв» з мяхамі

З кабінак каруселяў, дзесьці з-за кронаў дрэў, раз-пораз даносяцца крыкі наведвальнікаў, якія атрымалі сваю порцыю адрэналіну. Цікаўлюся, якія каруселі лічацца самымі небяспечнымі. «Любы механічны атракцыён ужо небяспечны, — адказвае Уладзімір. — І нават немеханічны, тая ж самая надзіманая горка, калі яна будзе няправільна замацавана. Увогуле чым вышэйшы атракцыён і чым хутчэй ён кружыцца, тым ён больш небяспечны».

Перад пачаткам эксплуатацыі на атракцыёнах праводзяцца дынамічныя выпрабаванні — на ўсіх рэжымах работы, прадугледжаных заводам-вытворцам. Падчас «тэст-драйва» выкарыстоўваюцца мяхі з пяском з двухкратнай нагрузкай: калі пасадачнае месца разлічана на сто кілаграмаў, на яго ставяць дзвесце і праводзяць выпрабаванні.

Асноўнай прычынай няшчасных выпадкаў Уладзімір лічыць асабістую халатнасць наведвальнікаў.

— Калі належыць быць прышпіленым, трэба быць прышпіленым. Кажуць, не пакідаць модуль да поўнага спынення — не зрывайцеся раней часу. Дзяцей не пускаюць на некаторыя каруселі не таму, што дзядзькі злыя, а таму, што рамяні бяспекі не разлічаны на гэтага малога. На коле агляду ёсць адкрытыя пасадачныя кабіны: ужо максімальна экстрэмальна. Але знаходзяцца людзі, якія спрабуюць падчас пад'ёму з-пад дуг бяспекі выбрацца. Няўжо гэта разумна? 99 са 100 няшчасных выпадкаў адбываюцца пасля слоў: «Глядзі, як я магу».

Да набору дзяжурных атракцыёнаў і гульнявога абсталявання ў нас ставяцца строга. Націскаць кнопкі на пульце кіравання не дазваляюць людзям, маладзейшым за 18 гадоў, і тым, якія не прайшлі навучанне і практыку па прафесіі дзяжурнага.

На ўсяляк выпадак: у дождж і моцны вецер на каруселях катацца забаронена. Гляджу на хмару, якая насоўваецца на парк.

***— Атрымліваецца, калі зараз пойдзе дождж, у дзяжурных будзе выхадны?***

— Не, работа проста прыпыніцца на нейкі час. Але заробак за гэтыя гадзіны супрацоўнікам усё роўна налічваецца.

## Чакаем новы атракцыён

Вы здзівіцеся, але большасць атракцыёнаў у сталічных парках — беларускай вытворчасці. Пры закупцы перавага аддаецца менавіта ім. Ёсць айчынныя кампаніі, якія спецыялізуюцца на выпуску каруселяў: яны выкарыстоўваюць італьянскія, нямецкія тэхналогіі і з'яўляюцца афіцыйнымі прадстаўнікамі славутых еўрапейскіх атракцыёнаў.

**Тэматычныя паркі ў Беларусі ўсё ж такі з'явяцца. Чарговы праект — парк Champions World, які прапануюць паставіць у Смалявіцкім раёне.**

— Новыя атракцыёны чакаюцца. Ці з'явяцца яны, мы вырашаем, зыходзячы з фінансава-эканамічнай дзейнасці прадпрыемства, наяўнасці свабодных абаротных грашовых сродкаў. Прыстойны атракцыён можа каштаваць больш за мільён рублёў. Па закрыцці сезона, у кастрычніку, падлічацца ўсе поспехі і будзе прынята рашэнне. Пакуль размова ідзе пра адзін новы атракцыён. У нас ёсць ужо прапанова і варыянты размяшчэння, — расказвае Уладзімір Бабіўскі.

Самая дарагая карусель у сталіцы — кола агляду ў парку Горкага. Яно, дарэчы, унікальнае. У свой час, у пачатку 2000-х, дзякуючы намаганням тагачаснага мэра горада Міхаіла Паўлава, для Мінска вырабілі адзінае кола агляду вышынёй 54 метры. На той момант самае высокае кола было 52 метры. Цяпер, праўда, рэкардсмены зусім іншыя. У Маскве плануецца ўсталяваць кола вышынёй каля 140 метраў. Але гэта ўсяго толькі на некалькі метраў больш, чым у Лондане.

***— Наколькі нашы паркі адпавядаюць сусветнаму ўзроўню?***

— Яны маюць сваё гістарычнае аблічча. У нас у аснову пакладзены камфортныя ўмовы. У той жа Расіі паркі забаў прыватныя, там жорсткая камерцыйная дзейнасць: мінімум укладанняў — максімум эфекту. На плошчы парку максімальна кампактна расстаўляюць атракцыёны, якія маюць. Самі каруселі могуць быць не ў ідэальным тэхнічным стане: такіх жорсткіх патрабаванняў, як у нас, у Расіі няма.

## Калі з'явіцца беларускі Дыснейленд?

Пытанне, якое хвалюе ўсіх аматараў паркаў забаў.

— Пад Дыснейленд патрэбны пэўныя плошчы: у іх адзін атракцыён займае гектар, — тлумачыць Уладзімір Бабіўскі. — А ў нас увесь парк Горкага — гэта 28 гектараў.

Па яго словах, Дыснейленд для Беларусі — вельмі дарагое заданне. І, хутчэй за ўсё, неакупнае. Узяць для прыкладу Дыснейленд, які знаходзіцца ў Арланда, ЗША. Гэта штат Фларыда, там няма зімы, і парк працуе 12 месяцаў на год. Ён не ведае перыяду нізкіх тэмператур. Адзін атракцыён такога ўзроўню абыходзіцца ў два-тры мільёны долараў. За ўваход на тэрыторыю трэба заплаціць каля соцені долараў.

**«Дзяцей не пускаюць на некаторыя каруселі не таму, што дзядзькі злыя, а таму, што рамяні бяспекі не разлічаны на гэтага малога».**

— А самы дарагі атракцыён у нас каштуе тры з палovай рублі, — параўноўвае Уладзімір Бабіўскі. — Гатовыя нашы жыхары аддаць па 200 рублёў на чалавека для паходу ў парк?

Праўда, тэматычныя паркі ў Беларусі ўсё ж такі з'явяцца. Чарговы праект — парк Champions World, які прапануюць паставіць у Смалявіцкім раёне. Але калі ён з'явіцца і колькі грошай спатрэбіцца на гэтую задуму, пакуль невядома.

## З сынам — на аўтадром

Ці шмат людзей катаецца на сталічных атракцыёнах? «Прапускная здольнасць гарадскіх паркаў — больш за мільён наведвальнікаў. Але трэба сказаць шчыра, гэта менш, чым раней. Тры-чатыры гады таму лічба была ўдвая большая. Напэўна, у людзей цяпер менш свабодных грошай, якія яны гатовы патраціць на забавы», — разважае галоўны інжынер.

Заўважаю ў парку атракцыён віртуальнай рэальнасці. Звычайная палатка з вялікімі крэсламі. Надзяваеш спецыяльныя акуляры — і вось ты ўжо імчышся ўніз з вышачэзных горак. Пытаюся ва Уладзіміра, ці не выцесняць атракцыёны новага пакалення звычайныя механічныя.

— Гэта як разважаць, ці не заменіць кіно тэатр. Не, не думаю, што гэта магчыма, — упэўнены ён.

Са сваімі дзецьмі, а дакладней з 10-гадовым сынам (бо дачка яшчэ маленькая для атракцыёнаў), Уладзімір у парку таксама бывае.

— Раней з сынам часцей хадзілі, яму падабаўся аўтадром. А цяпер ён стаў дарослы, — усміхаецца. — Не, не на камп'ютарныя гульні пераключыўся. Сын у мяне займаецца спортам. Яму больш цікавыя «вяровачныя гарадкі»: там ты можаш паспрабаваць свае сілы, і гэта займае не тры хвіліны, як на «Цэнтрыфузе». Хоць бачу, што яго аднагодкі з задавальненнем ходзяць на атракцыёны. І не, для свайго дзіцяці я не выкарыстоўваю службовае становішча *(смяецца)*.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

lubneuskaya@zviazda.by


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

■ Свая справа

# ДАСЛЕДЧЫК ЖЫВЕ Ў КОЖНАЙ МАЛЕЧЫ

## Пераканана стваральніца Экалабараторыі Надзея АКСЁНЕНКА

**Ідэя стварыць студыю для маленькіх навукоўцаў з'явілася ў Надзеі, яшчэ калі яна была цяжарнай. Цяпер Экалабараторыі, як і яе дачушцы Настачцы, пяць гадоў. Маладая мама расказала, чаму на заняткі ў дзіцячую навуковую студыю карысна хадзіць не толькі будучым акадэмікам.**



***— Вельмі часта маладых мам на адкрыццё сваёй справы натхняюць іх дзеці. Відаць, так сталася і ў тваім выпадку?***

— Ну так, разам з дзецьмі часта нараджаецца сваё прызначэнне. Яны наогул усё жыццё пераварочваюць з ног на галаву. У дзяцінстве я кожнае лета праводзіла ў вёсцы: з рознымі апалонікамі, жабкамі, матылькамі. Увесь час у гульнях быў прыродны элемент. Тое, што мне самой калісьці падабалася, цяпер, дзякуючы Насці, перарастае ў нешта больш маштабнае, значнае.

***— Надзя, ты хочаш, каб усе твае вучні сталі ў будучыні вучонымі, даследчыкамі? Альбо веды па хіміі, фізіцы, астраноміі ды біялогіі патрэбны не толькі для гэтага?***

— Я не ставлю задачу зрабіць іх усіх вучонымі. Для мяне важна, каб дзеці праз гульню зразумелі складаныя ўзаемасувязі матэрыялаў, з'яў і працэсаў у гэтым свеце, былі больш уважлівыя, назіральныя, усё правяралі, а не бяздумна давяралі. Бо ў будучым, калі яны стануць дарослымі, адна з самых запатрабаваных якасцяў — аналітычны і дапытлівы розум, уменне дапусціць штосьці і праверыць сваю гіпотэзу, зрабіць высновы. Сучасным дзецям гэта цяпер цяжка. Напэўна, таму, што шмат чаго атрымліваюць гатовым.



***— Калі еду ў метро, то складаецца ўражанне, што большасць сучасных дзяцей цікавяць толькі гаджэты...***

— Калі ў мяне з'явілася дачка, я стала часта і падоўгу назіраць за хлопчыкамі і дзяўчынкамі. І зразумела, што даследчык жыве ў кожным дзіцяці. Малыя любяць рабіць адкрыцці, здагадвацца, вынаходзіць. Але не ўсе бацькі падтрымліваюць гэтую жывую цікаўнасць да свету. Часам інтарэс да таго, як усё ўладкавана, губляецца па шэрагу прычын, але зацікавіць зноў можна кожнага. Бо дзеці вельмі моцна і лёгка пераймаюць тое, што вакол іх. Гэта мы праверылі і ў Экалабараторыі. Калі правільна зададзены вектар, то дзеці ў чаканні заняткаў не сядзяць у гаджэтах, а актыўна абмяркоўваюць свае тэорыі і здагадкі, дзеляцца вынікамі хатняга задання, задаюць пытанні.

***— А чым пазнавальным бацькі могуць пазаймацца з дзецьмі дома ў звычайных умовах, без нейкага адмысловага абсталявання?***

— Дзеці вельмі любяць назіраць за зоркамі. Чаму б не зрабіць гэты працэс пазнавальным? Можна намаляваць на кардоне сузор'е, пракалоць на месцы зорачак дзірачкі і злучыць іх каляровым матузком. Гатовую «зорную вышыўку» можна павесіць у дзіцячым пакоі. З сузор'ямі наогул шмат усяго цікавага. Пра іх можна легенды пачытаць, а потым пашукаць падчас прагулкі. Цяпер шмат астранамічных праграм: наводзіш на начное неба тэлефон, і ён расказвае, што гэта за сузор'е. Вельмі любяць выхаванцы Экалабараторыі назіраць за аблокамі. У інтэрнэце можна знайсці адмысловую рамку: калі навесці яе на воблака, то будзе зразумела, да якога віду яно адносіцца. Мая Насця мінулым летам пастаянна з гэтай рамкай хадзіла: «О, вунь кучава-дажджавое воблака паляцела. Хутка — дождж». Ёсць у інтэрнэце шмат развіваючых гульняў. Той, хто шукае, знаходзіць. Іншая справа, што дарослым, як правіла, не хочацца гуляць.

***— А ты сама з дачкой часта гуляеш?***

— Насця ходзіць на некаторыя заняткі да мяне ў Экалабараторыю. Але і акрамя гэтага мы шмат чаго цікавага робім дома. На выхадных, напрыклад, ездзілі на лецішча. Знайшлі там прыгожага вусеня. Падкормлівалі яго. Ён у нас пажыў пару дзён і завярнуўся ў кукалку. Чакаем, які матылёк з яе з'явіцца. Мухалоўкі пасяліліся на кусце бружмелю, мы назіралі за імі, пачынаючы з яек, потым былі пухнатыя птушанякі. Ягады ўсе абсыпаліся, не хацелі турбаваць малых. Зараз птушаняты ўжо навучыліся лётаць і жывуць у нашым садзе.

Яшчэ ў нас у кватэры расутуць яблыні ў вазоне. Пачалося з таго, што я купіла яблыкі, а там былі зернеткі з парасткамі. Насця іх пасадзіла. Цяпер чакаем, што вырасце. Можа, мы пасля перасадзім саджанцы каля дома, і ў нас будуць свае яблыкі. З усякай костачкі можна вырасціць нейкую расліну. Не факт, што яны прыжывуцца ў нашых умовах, але цікава правесці даследаванне. Дзеці вельмі любяць свае градкі. У Насці на балконе чатыры вазоны, за якімі яна сама даглядае і назірае, як там што расце. Так радуецца, калі штосьці квітнее. І на лецішчы ва ўсім хоча паўдзельнічаць. Яшчэ дачка вельмі любіць жывёл, год таму папрасіла мяне купіць чарапашак.

***— Як правіла, дзеці просяць хатніх жывёл, але ў выніку за імі даглядаюць бацькі. Памятаю, я таксама ў дзяцінстве прынесла дадому марскіх свінак, а пасля мама іх карміла і чысціла клетку.***

— Чышчу акварыум пакуль што я. Але ў Насці ёсць іншыя абавязкі. Яна ўключае святло, выгульвае іх, падкормлівае. Я часам кажу: «Насця, па-мойму, да чарапах сёння ніхто не падыходзіў, ідзі з імі пагавары». Калі нагадваць, то яна з задавальненнем ідзе і размаўляе з імі. Калі не, то забываецца. Дзеці ёсць дзеці. Але, на мой погляд, адразу варта падзяліць абавязкі.

***— Да цябе ў Экалабараторыю прыходзяць дзеці ад 4 гадоў. Здавалася б — такія малыя, што яны зразумеюць, і як ім растлумачыць штосьці?***

— Але менавіта яны робяць на другім годзе навучання велізарны прарыў. Вядома, маленькім дзецям падабаецца ўсё змешваць, каб адразу шмат пены, шыпення і іншых спецэфектаў і бурных рэакцый. За першы год, пакуль мы разбіраем фізіку і хімію, у іх назапашваецца добры багаж ведаў і вопыту, што дазваляе ў далейшым лёгка ўспрымаць абстракцыі на курсе другога года па астраноміі.

Цяпер усё даступна, нават занадта. Вельмі шмат шоу ў нашым жыцці, на кожным кроку. Дзеці прызвычайваюцца. Я заўважыла, што сучасныя дзеці не ўмеюць чакаць. Хоць гэта адно з асноўных уменняў, якое трэба сфарміраваць да 6 гадоў — адтэрміноўваць жаданае, калі немагчыма атрымаць цяпер. У гэтым дапамагае батаніка, бо каб вырасціць расліну, патрэбна нямала цярпення.

***— Часта назіраю, як маленькія «чамучкі» даймаюць сваіх бацькоў: «Чаму гэта, а чаму тое?» Тыя ж у гэты час размаўляюць па тэлефоне альбо кажуць: «Адчапіся, надакучыў са сваімі пустымі пытаннямі».***

— Мне шкада такіх дзяцей. Калі я ведаю адказ на пытанне, абавязкова адказваю. Але часам пытанні Насці і маіх вучняў ставяць нават мяне ў тупік. Тады лезу ў інтэрнэт: «Я не ведаю, зараз мы пачытаем». На некаторыя пытанні адказ адразу не знаходзіцца. Толькі з цягам часу. Галоўнае — не забывацца адказваць на пытанні. Я лічу, гэта вельмі важна.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

*nadzieja@zviazda.by*

■ Нататкі таткі



# «АДКУЛЬ Я ЎЗЯЎСЯ?»

## Чаму абавязкова гаварыць з дзецьмі пра секс

**Гэты момант аднойчы прыйдзе — і тваё дзіця, сур'ёзна гледзячы табе ў вочы, запытаецца: «Тата, адкуль я ўзяўся?» І гэтае пытанне куды страшнейшае за жончына «Ты памятаеш, які сёння дзень?» Бо з жонкай так ці інакш дасі рады, а вось што сказаць маленькаму чалавеку, як не шакіраваць яго жорсткай фізіялагічнай праўдай пра тое, чым займаліся тата і мама дзеля яго з'яўлення на свет? Таму многія бацькі адцягваюць гэты момант і хаваюцца за байкі пра бусла ці капусту. На самай справе гаварыць з дзецьмі пра секс не толькі можна, але і неабходна. Але як рабіць гэта правільна?**

Здавалася б, даўно мінулі тыя часы, калі пры слове «секс» асабліва далікатныя натуры чырванелі. Пра гэта багата гавораць і пішуць не толькі прагныя да рэйтынгаў журналісты, але і сур'ёзныя спецыялісты накшталт псіхолагаў і дактароў. Але не скажаш, што ўсё грамадства ставіцца да гэтай тэмы спакойна і па-медыцынску ўзважана, асабліва калі справа датычыць палавога выхавання дзяцей і падлеткаў. То там, то сям



чуюцца істэрычныя выгукі пра «разбэшчванне» маладога пакалення, а палавая асвета выстаўляецца як корань усясветнага зла. Маўляў, меней ведаюць — меней венерычных хвароб і ранніх цяжарнасцяў. Хоць сусветны досвед гаворыць аб адваротным: невуцтва — адна з асноўных прычын вышэйзазначаных праблем, бо інстынкт размнажэння ўсё адно працуе, а разумення, што і як з ім рабіць, няма.

А цікавасць да фізіялагічнага боку адносін паміж мужчынам і жанчынай у дзяцей рана ці позна ўзнікае. Хіба што спосабы яе спатолення мяняюцца ў залежнасці ад эпохі. Калі яшчэ не было інтэрнэту з яго «вясёлымі» карцінкамі, мы з аднагодкамі ўпотай гарталі эратычныя газеткі і часопісы. І ў гэтым нашае пакаленне не было ўнікальным: пачытаўшы ўспаміны Янкі Брыля і Рыгора Барадуліна, я зразумеў, што ў беларускай вёсцы з усёй яе традыцыйнасцю і «цнатлівасцю» з сексу ніхто не рабіў сакрэту Палішынеля. Бо гэта жыццё.

Але ў наш больш свабодны ва ўсіх адносінах час многія бацькі баяцца шчыра гаварыць з дзецьмі пра інтымныя адносіны. І робяць тым самым вялікую памылку: не атрымаўшы адказу на пытанне ад таты і мамы, маленькі чалавек звернецца да аднагодкаў або, што больш верагодна, да інтэрнэту. Што ён там прачытае і пабачыць ды ў якой інтэрпрэтацыі — уявіць няцяжка. Ды многія бацькі папросту саромеюцца такой далікатнай тэмы і стараюцца адцягнуць гэтую важную размову.

Хоць саромецца няма чаго: трэба разумець, што секс — гэтакі ж натуральны для чалавека працэс, як яда і сон. І ў той жа час не самае галоўнае, дзеля чаго жыве чалавек. І чым раней мы раскажам сваім дзецям пра гэту з'яву, тым лепей: бо пазбяганне тэмы толькі распальвае цікаўнасць юнай чалавечай істоты да «забароненага плода». Але ж тыповая рэакцыя большасці бацькоў, калі дзіця, напрыклад, выпадкова пабачыла эратычную сцэну ў кіно, — «Прэч адсюль! Няма чаго табе тут глядзець!» Калі вы так робіце, то віншую: вы ўжо «заякарылі» ў свядомасці малога, што ёсць нейкая таямніца, якую дарослыя чамусьці хаваюць. А пасля, калі вы такі наважыцеся завесці размову, то акажацца, што дзіця ўжо вывучыла «матчастку» па відэароліках у інтэрнэце. Вядома, без усведамлення маральна-этычных нюансаў інтымнага жыцця людзей.

Такім чынам, мы прыйшлі да таго, што гаварыць з дзецьмі пра гэта трэба. Але як — таксама праблема для бацькоў. Прычым адзінага адказу на гэтае пытанне няма нават у спецыялістаў: розныя сайты даюць розныя парады. А сярод адпаведных кніг для бацькоў і дзяцей, што даводзілася трымаць у руках, талковых не так багата. Адны напісаны занадта груваcткай мовай, другія — даюць залішнюю інфармацыю, паглыбляючыся ў апісанні сексуальных адхіленняў. Напэўна, ёсць сэнс распрацаваць з удзелам дактароў, педагогаў, псіхолагаў нейкі дапаможнік для школ і бацькоў пра тое, як падаваць дзецям гэтую далікатную тэму. Свайго кшталту падручнік, у якім бы навукова і абгрунтавана тлумачылася, што і да чаго.

Але адно для мяне відавочна: гаварыць з дзіцем пра секс трэба спакойна і будзённа, не чырванеючы. Такім тонам, быццам бы чытаеш інструкцыю да мікрахвалевай печкі. І пры гэтым не надта паглыбляючыся ў нюансы: не трэба перагружаць юныя мазгі. Няхай для іх гэта будзе інфармацыя з таго ж самага шэрагу, што Зямля круціцца вакол Сонца. Базавыя веды пра свет, да якіх ставішся звыкла і без асаблівага ўзрушэння.

Зрэшты, мне ў гэтым сэнсе пашанцавала: у сябе ў хаце я выпадкова знайшоў стары савецкі дыяфільм «Адкуль бруцца дзеці». Запылены фільмаскоп для яго паказу таксама знайшоўся. Тэхналогія мезазойская, але змест стужкі аказаўся настолькі ўзважаным і выверaным, што навамодныя опусы дзіцячых псіхолагаў проста «кураць» убаку. Хоць дыяфільм быў створаны ў краіне, дзе сексу фармальна не было. Затое быў моцны навуковы падыход. У тым ліку, да выхавання будучых грамадзян.

**Валянцін БОЙКА.**

**Уведомление**
**Наблюдательный совет ОАО «Универсам Фрунзенский» сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 17 августа 2017 года в 13.00 со следующей повесткой дня:**

1. О заключении договора купли-продажи недвижимого имущества.

**Собрание состоится по адресу:** г. Минск, пр. Пушкина, 37, офис ОАО «Универсам Фрунзенский».

Регистрация участников собрания будет проводиться в день собрания с 12.00 до 13.00.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера — доверенность и документ, удостоверяющий личность.

**Наблюдательный совет ОАО «Универсам Фрунзенский».**

УНП 100135329

**Изменения в проектной декларации**
## ООО «ДАТЧ СТАР»,
**опубликованной в газете «Звязда» 17.05.2017 г. №91**

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№1 по генплану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6–11 секции, II очередь строительства, секции 1–3)» (I очередь строительства, 5–6 пусковой комплекс):

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

5 (пять) двухкомнатных квартир по принципу «свободной планировки» площадью от 58,59 до 74,34 кв. м: стоимость 1 кв. метра от 930 до 1120 долларов США.

5 (пять) трехкомнатных квартир по принципу «свободной планировки» площадью от 75,62 до 87,17 кв. м: стоимость 1 кв. метра от 960 до 1070 долларов США.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. 3-я Щорса, 9, офис 505.

**Тел.: +375 44 53 43 000, +375 29 53 43 000**

УНП 191061436

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает об открытом аукционе по продаже здания павильона для хранения стеклобанки,**
**Минская обл., Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Либава-Роменская, 62**

| | **Начальная цена продажи, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** |
|---|---|---|
| Лот №1. Павильон для хранения стеклобанки с инв. №630/С-4738. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Г.п. – 1979; Этажность – 1; Общая площадь – 1895,3 кв. м. Фундамент – ж/бетонные фундаментные блоки; Стены наружные и внутренние – кирпичные, силикатные блоки, ж/бетонные панели; Перегородки – кирпичные; Перекрытия – ж/бетонные фермы; Крыша – совмещенная рулонная; Полы – бетонные; Проемы оконные – глухие; Проемы дверные – ворота, простые; Электроснабжение – наружная проводка; Вентиляция – естественная | 367 084,70 | 36 700,00 |

**СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ**

Земельный участок с кадастровым номером 623850100003002604, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Либава-Роменская, 62, пл. 0,4913 га. Назначение – земельный участок для содержания и обслуживания здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (павильон для хранения стеклобанки). Право постоянного пользования.

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.

2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 07.09.2017 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4. Шаг аукциона 5%.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в открытом аукционе по продаже имущества (Павильон для хранения стеклобанки) (Лот №1), проводимом 07.09.2017 (Молодечненский МРО).

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске по ул. Комсомольской, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 05.09.2017 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: гл. инж. унитарного предприятия «Молодечненский пищевой комбинат» Гостилович Виталий Николаевич 8-0176-77-27-25; гл. бух. унитарного предприятия «Молодечненский пищевой комбинат» Груздь Валерий Казимирович 8-0176-77-27-26.

**Контакты организатора аукциона:**
**8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

**И З В Е Щ Е Н И Е о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «Строительный трест №17 ордена Трудового Красного Знамени» 30 августа 2017 года**

| № лота | Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь) | Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб., к. (без учета НДС) | Размер задатка, бел. руб., к. | Характеристика объекта | Условие аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 700/С-101876 (здание склада гашения извести), общей площадью 159,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская область, г. Могилев, ш. Славгородское, 167/16 | 15 830 р. 00 к. | 791 р. 50 к. | Одноэтажное кирпичное здание склада гашения извести. Фундамент – кирпичный; стены – кирпичные; крыша – асбестоцементный волнистый лист; полы – бетонные; ворота – металлические. | Без условий |

**Аукцион состоится 30 августа 2017 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.**

Заявки принимаются ежедневно – с 28 июля 2017 года в рабочие дни с 8 до 17 часов (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.

**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 28 августа 2017 года до 17.00. Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.**

Заключительная регистрация участников аукциона – 30 августа 2017 года с 14.00 до 15.00.

Продавец: ОАО «Строительный трест №17 ордена Трудового Красного Знамени», 212002, г. Могилев, б-р Непокоренных, 28, тел. (80222) 48-82-68, 48-45-48, 48-35-75.

Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактный телефон – (80222) 42-25-64.

Площадь земельного участка с кадастровым номером 740100000007005012 площадью 11,8239 га для содержания и обслуживания зданий и сооружений.

Аукцион проводится в соответствии с порядком проведения открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Строительный трест №17 ордена Трудового Красного Знамени».

Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона, подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:

**- документ, подтверждающий внесение суммы задатка** на расчетный банковский счет организатора аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации» – BY66BLBB30120700008710001001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, код BLBBBY2X, УНП 700008710 с отметкой банка;

**- юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь –** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

**- иностранным юридическим лицом –** легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

**- иностранным индивидуальным предпринимателем –** легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

**- представителем юридического лица Республики Беларусь –** доверенность, выданная в установленным законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

**- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь –** нотариально удостоверенная доверенность:

**- представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя –** доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе с приложением всех необходимых документов, внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный банковский счет сумму задатка, заключившие с организатором аукциона соглашение, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе и получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления.

Организатор аукциона имеет право отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона. Объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в том же печатном издании, в котором публиковалось извещение. Кроме того, организатор аукциона должен проинформировать участников, подавших заявление на участие в аукционе, об отказе от проведения аукциона.

Перед началом аукциона их участники обязаны зарегистрироваться у организатора аукциона и обменять билеты участников на аукционные номера, которые возвращаются организатору аукциона после их окончания.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе аукциона наивысшую цену.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов (далее – единственный участник аукциона).

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

После предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение аукциона, в установленном порядке, в соответствии с подписанным в день проведения аукциона соответствующим протоколом, между продавцом предмета аукциона и победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается договор купли-продажи предмета аукциона.

Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (единственным участником аукциона) в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником аукциона) в белорусских рублях в установленном порядке на расчетный счет продавца.

Условия оплаты – по согласованию с продавцом возможно предоставление рассрочки платежа до 6 месяцев.

С объектом можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов, предварительно согласовав время с продавцом.

В предусмотренных законодательством случаях уплачивается штраф организатору аукциона в течение одного месяца в размере 20 процентов от начальной цены продажи предмета аукциона: победителем аукциона – в случае, если он в установленный срок не подписал протокол о результатах аукциона, не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, не подписал договор купли-продажи предмета аукциона; лицом, приравненным к победителю аукциона, – в случае его отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора купли-продажи предмета аукциона; участниками аукциона – в случае их отказа объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным.

**Контактный телефон организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: г. Могилев, (0222) 42-25-64.**

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (микрорайоны «Зарица-4», «Заболоть») 29 августа 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок У-1623 * | микрорайон «Зарица-4» | 0,1004 | 440100000003004387 | - | 11 464,26 | 2 300 |
| 2. | Земельный участок У-616* | микрорайон «Заболоть» | 0,1010 | 440100000002008544 | - | 13 063,73 | 2 600 |

***Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.***

Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 №49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 29 августа 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

